Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 САКАВІКА 2012 г. ЧАЦВЕР № 41 (27156) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пакінуты ў двары шматпавярхоўкі і забыты гаспадарамі састарэлы аўтамабіль зусім не рэдкасць. Як уласніку ад яго пазбавіцца і колькі гэта каштуе?

СТАР. 5



«Чым больш жыву ў Мінску, тым больш знаходжу агульнага паміж нашымі народамі».

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА



Аляксандр ГЛЕБ змяніў Заходнюю Еўропу на ўзбярэжжа Волгі.

СТАР. 6

## ЦЫТАТА ДНЯ



Фота БЕЛТА.

**Прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй САВІНЫХ:**

***«У Брусэлі і сталіцах дзяржаў Еўрасаюза не павінны забываць, што ў адносінах да Беларусі тактыка запалохвання не працуе. На аднабаковых умовах, умовах сілавога націску нармалізацыя адносін немагчымая»***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8110,00 | ▲ |
| Еўра | 10920,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279.50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1014,45 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 4° |
| Віцебск | – 2° |
| Гомель | – 2° |
| Гродна | + 4° |
| Магілёў | – 2° |
| Мінск | 0° |

ISSN 1990 - 763X

# ПЕРШАСАКАВІЦКАЯ ПЕРАКЛІЧКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Прылепы, Смалявіцкі раён.

## Анатоль ТОЗІК:

# «ЗАМОЎЧВАННЕ ПРАБЛЕМ ПАДРЫВАЕ ДАВЕР ДА СІСТЭМЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ»

**«Сёння сістэма аховы здароўя застаецца адным з самых закрытых з пункту выстройвання камунікацый з грамадствам ведамствам, — такую думку выказаў на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль ТОЗІК. — Нават сілавыя ведамствы выступаюць з самакрытыкай сваіх праблемных зон і надаюць значна больш увагі пытанням фарміравання даверу і павагі да іх з боку насельніцтва. З боку аховы здароўя такой адкрытасці не назіраецца. У СМІ не прадстаўлены шырока меркаванні ўрачоў-практыкаў, прафесіяналаў сваёй справы, а толькі пазіцыя чыноўнікаў ад медыцыны. Адсутнічае сістэмны аналіз скаргаў пацыентаў і іх сваякоў, няма глыбокага бачання сітуацыі. Такое замоўчванне, ігнараванне схаваных праблем, адсутнасць самакрытычнага погляду на рэальныя рэчы, нежаданне прызнаваць свае памылкі ў выніку падрываюць давер да сістэмы аховы здароўя і спрыяюць дзяленню на «мы» і «яны».**

Як падкрэсліў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада, згодна з артыкулам 41 Закона «Аб ахове здароўя» ў пацыентаў ёсць права на выбар як лечачага ўрача, так і арганізацыі аховы здароўя:

— Я хачу, каб мы разам з вамі падумалі, як прыступіць да рэалізацыі гэтага права, прычым увязалі б гэтае пытанне з аплатай працы ўрача, з канкрэтнымі вынікамі яго работы. Заробкі ўрача павінны залежаць ад таго, колькі пацыентаў жадаюць у яго абслугоўвацца. Як няма двух аднолькавых спецыялістаў, так і не павінна быць і двух аднолькавых заробкаў. У бягучым годзе трэба максімум увагі ўдзяліць амбулаторна-паліклінічнаму звяну і ўчастковым ўрачам: я маю на ўвазе і іх заробкі, і статус, і ўмовы працы, і працоўныя месцы. Давайце больш інтэнсіўна развіваць інстытут памочніка ўрача. У Еўропе даволі актыўна выкарыстоўваецца кансультаванне пацыентаў па тэлефоне. Чаму б нам не пазычыць такую практыку? Тым больш што з гэтай задачай цалкам можа справіцца і сярэдні медыцынскі персанал. Трэба ўзнімаць статус і аўтарытэт сярэдняга медыцынскага персаналу.

Па звестках Міністэрства аховы здароўя, летась у арганізацыі аховы здароўя прыйшлі працаваць па размеркаванні больш як 2 тысячы выпускнікоў. Аднак патрэба ў кадрах не змяншаецца з года ў год...

— Магчыма, нам трэба пераходзіць на іншую сістэму разліку патрэбы ў кадрах і зацікаўленасці? Навошта кожны год выпускаць па 2 тысячы маладых спецыялістаў, рыхтаваць кадры для нашых усходніх і заходніх суседзяў? Магчыма, лепш было б накіраваць зэканомленыя рэсурсы на стварэнне добрых умоў для тых, хто прыступае да работы па размеркаванні? Я па-ранейшаму настойваю на тым, што трэба павялічыць тэрмін адпрацоўкі маладых спецыялістаў па размеркаванні, аднак мае рацыю і міністр аховы здароўя — трэба стварыць для маладога спецыяліста адпаведныя ўмовы, каб замацаваць яго на працоўным месцы.

СТАР. 2

## ЧАМУ КУРС УПАЎ І ЦІ БУДЗЕ ЁН РАСЦІ?

**Думаю, шмат хто заўважыў, што курс долара пазаўчора дасягнуў мяжы, да якой ужо даўно не апускаўся, — 8070 рублёў. «А чаму гэта адбылося?» — напэўна, падумалі вы. Тое ж самае пытанне зацікавіла і «Звязду». Па адказ газета звярнулася да экспертаў.**

**Ірына НОВІКАВА, загадчыца кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар:**

— Паніжэнне курсу звязана ў першую чаргу з тым, што кіраўніку дзяржавы ўдалося заключыць пагадненне з Расіяй па газе і нафце. Адпаведна, Мазырскі і Наваполацкі нафтаперапрацоўчыя заводы працуюць на поўную магутнасць і закупляюць нафтавую сыравіну па добрых цэнах.

СТАР. 3

## «НЕ ТРЭБА АБСТАЎЛЯЦЬ ДЫЯЛОГ УМОВАМІ»

**Падзеі апошніх дзён падштурхоўваюць да высновы, што благі мір у адносінах Беларусі з Еўрасаюзам усё ж змяніла добрая сварка. Савет міністраў замежных спраў краін ЕС пашырыў кола асоб, на якіх распаўсюджваюцца санкцыі.**

Беларускае знешнепалітычнае ведамства адклікала паслоў з Варшавы ды Брусэля для кансультацый і рэкамендавала еўрапейскаму боку пераняць гэты прыклад. Афіцыйны Брусель заявіў аб адкліканні ўсіх кіраўнікоў дыпламатычных місій краін ЕС. Слова за слова — і перад намі ўжо канфрантацыя не абы-якіх маштабаў. Калі адкінуць усё наноснае, то ключавых пытанняў літаральна два, і абодва знаёмыя да болю: хто вінаваты і што рабіць?

СТАР. 2

## ЗА ПРАЖЫВАННЕ Ў НЕПРЫВАТЫЗАВАНЫХ КВАТЭРАХ МОГУЦЬ УВЕСЦІ АРЭНДНУЮ ПЛАТУ?

**Падобныя пагалоскі сярод нашых чытачоў пачалі гуляць адразу пасля таго, як сталічнае кіраўніцтва паведаміла аб планах па стварэнні арэнднага жыллёвага фонду. Вядома, што тэма арэнднага жылля тычыцца толькі камерцыйнага выкарыстання жылых памяшканняў для бескватэрных, аднак людзі хвалююцца...**

Насамрэч, у праекце новага жыллёвага Кодэкса прадугледжана збіранне платы з тых жыхароў, якія жывуць у кватэрах дзяржаўнага жыллёвага фонда ў якасці наймальнікаў.

СТАР. 3

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЗНАГАРОДЗІЎ ОРДЭНАМ МАЦІ ЖАНЧЫН, ЯКІЯ ВЫХАВАЛІ ПЯЦЬ І БОЛЬШ ДЗЯЦЕЙ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей узнагародзіў шматдзетных жанчын краіны ордэнам Маці. Указ аб гэтым кіраўнік дзяржавы падпісаў 28 лютага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Сярод узнагароджаных ордэнам Маці — паштальён аддзялення паштовай сувязі Пінск-15 Алена Лянкевіч, прадавец магазіна «Купалінка» Докшыцкага райпо Ганна Макатур, хатняя гаспадыня з Віцебска Наталля Шынько, лабарант Мазырскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Наталля Капітан, санітарка Гомельскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Аляксандра Маслякова, работніца Дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Слаўгарадскага раёна Святлана Паўлюкова, выкладчык Крычаўскага дзяржаўнага прафесійнага агратэхнічнага каледжа Ірына Подава, хатняя гаспадыня з Маладзечна Жанна Баранава, прадавец вытворчага кааператыва «Дары прыроды» г. Барысава Наталля Сарачынская.

■ Беларусь — ЕС:

# «НЕ ТРЭБА АБСТАЎЛЯЦЬ ДЫЯЛОГ УМОВАМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тое, што адбылося ў стасунках Беларусі і Еўрасаюза, паводле выразу **Віктара Гумінскага, намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў,** заслугоўвае шкадавання. «Але трэба прама сказаць, што ініцыятарам такіх дзеянняў не была Беларусь. Палітыка, якую абралі кіраўнікі ЕС, працягваецца не першы год. І мы самі адчуваем, кантактуючы з дэпутатамі парламентаў заходнееўрапейскіх дзяржаў, што і парламентарыі, і народы ў большасці сваёй такую палітыку не прымаюць, — адзначае віцэ-спікер, які нядаўна вярнуўся з Вены, дзе браў удзел у рабоце зімовай сесіі ПА АБСЕ. — На жаль, сёння ў ЕС правяць баль асобныя палітыкі».

Заява кіраўніка Еўрапарламента Марціна Шульца, які ахрысціў дзеянні беларускага боку варожымі, паводле ацэнкі В. Гумінскага, выходзіць за рамкі дыпламатычнага этыкету. «Больш міралюбівай краіны, чым Беларусь, здаецца, няма. Мы нікому ніколі не пагражалі. Мы толькі адказвалі. І калі асобныя палітыкі думалі, што іх дзеянні застануцца без увагі з боку кіраўніцтва нашай дзяржавы, то такая палітыка недальнабачная».

Віцэ-спікер акцэнтаваў, што Беларусь — суверэнная дзяржава і мае права самастойна рухацца наперад, развівацца. «Калі не хочаце нам дапамагаць, то прынамсі не перашкаджайце і не ўмешвайцеся ў нашы ўнутраныя справы, гэта нікому не дазволена. Я парэкамендаваў бы палітыкам, якія сталі на шлях канфрантацыі, звярнуць увагу на праблемы, якія ёсць у іх дзяржавах і ў ЕС у цэлым», — заявіў Віктар Гумінскі. Шлях канфрантацыі, ціску, шантажу, пагроз, на яго думку, вядзе ў нікуды.

Згадваючы свой нядаўні ўдзел у рабоце сесіі ПА АБСЕ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў адзначыў неканструктыўнасць спецыяльнай рабочай групы Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Беларусі пад кіраўніцтвам Уты Цапф. «Яна не палічыла неабходным запрасіць нас на мерапрыемства, якое яна праводзіла паміж пасяджэннямі, каб выслухаць і нашу пазіцыю. А тое, што там абмяркоўвалася, не выглядае як рабочае мерапрыемства па навядзенні мастоў для нашага супрацоўніцтва. Размова там ішла пра ўвядзенне эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі і прыняцці захадаў па павышэнні іх эфектыўнасці», — кажа кіраўнік беларускай дэлегацыі. «Толькі канструктыўны дыялог, без націску, можа даць адпаведныя вынікі. На жаль, гэтага сёння не адбываецца», — адзначае В. Гумінскі.

Яго погляды падзяляе чалавек з багатым досведам дыпламатыі — **Ніна Мазай, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы,** якая таксама прадстаўляла беларускую дэлегацыю ў ПА АБСЕ: «Я гаварыла бы не пра гатоўнасць Беларусі рабіць крокі па выкананні патрабаванняў ЕС, а пра тое, што абодва бакі маюць сваю пазіцыю. І толькі ў двухбаковых кантактах, у дыялогу, дзе кожны можа выказаць сваю пазіцыю, дзе бакі выслухоўваюць адзін аднаго, можа быць нейкі вынік». Калі варта яго чакаць, палітык прагназаваць не бярэцца, роўна як і тое, наколькі ўвогуле будуць гатовы еўрапейскія структуры вярнуцца да гэтага дыялогу. «Не думаю, што яго трэба абстаўляць нейкімі ўмовамі, — акцэнтавала Н. Мазай. — Абодва бакі павінны весці канструктыўны дыялог на нармальнай спакойнай аснове».

Што больш верагодна: згаданая развязка або далейшая эскалацыя канфлікту — пакажа час.

**Ала МАЧАЛАВА.**

**Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:**
— Еўрасаюз у дачыненні да Беларусі займаецца звядзеннем дробных рахункаў, не маючы рэальнага ўяўлення пра краіну.

**Міхаіл ДЗЯЛЯГІН, старшыня прэзідыума Інстытута праблем глабалізацыі (Расія):**
— Еўрасаюз спрабуе адцягнуць увагу сваіх жыхароў ад унутраных праблем пры дапамозе дыпламатычнай вайны з Беларуссю.

**Дырэктар Еўрапейскага цэнтра геапалітычнага аналізу Матэвуш ПІСКОРСКІ (Польшча):**
— Спадзяюся, што гэта часовая сітуацыя і што мы будзем у стане з цягам часу высветліць усе рознагалоссі паміж Еўрасаюзам і Беларуссю. Тым больш што большасць палітыкаў і экспертаў у ЕС прытрымліваецца думкі, што для вядзення дыялогу трэба прысутнічаць.

## АБЗАЦ

◢ Міжнародны дзіцячы песенны конкурс «Еўрабачанне-2012» пройдзе ў Амстэрдаме 1 снежня. Такое рашэнне было прынята на сустрэчы прадстаўнікоў Еўрапейскага вяшчальнага саюза і нідэрландскіх арганізатараў музычнага спаборніцтва.

◢ **Работнікі выратавальных станцый Мінскай вобласці гэтай зімой выратавалі дзевяцярых аматараў падводнага лову.**

◢ На працягу першага квартала гэтага года ў Беларусі павінна быць цалкам спынена вытворчасць аналагавых тэлевізараў. Аб гэтым паведамілі ўчора на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела бытавой тэхнікі ўпраўлення бытавой тэхнікі і электронікі Міністэрства прамысловасці Мікалай Глазко.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **Жыхар харвацкага горада Дуброўнік сарваў джэкпот у 13,4 млн кун (каля 2,3 млн долараў) пасля таго, як 30 гадоў штотыдзень купляў латарэйныя білеты і адзначаў у іх адны і тыя ж лічбы. Мужчына ўгадаў камбінацыю 2, 4, 7, 13, 17, 24, 36 у лато па формуле «7 з 39» падчас чарговага розыгрышу 11 лютага, купіўшы білет за 20 кун (каля 3,5 долараў). У апублікаваным у аўторак інтэрв'ю ён расказаў, што проста быў верным сабе і выбраным лікам, якія былі звязаны з важнымі датамі для яго і родных. Пераможца латарэі паведаміў, што частку грошай ён патраціць на радню, якая жыве ў цяжкіх умовах.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# «ЗАМОЎЧВАННЕ ПРАБЛЕМ ПАДРЫВАЕ ДАВЕР ДА СІСТЭМЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І не варта баяцца адпраўляць маладых людзей на стажыроўку ці працу за мяжу — у сур'ёзныя кампаніі, клінікі і ўніверсітэты. Мы павінны ўсё карыснае і цікавае, што ёсць за мяжой, цягнуць у сваю краіну. Таксама не варта баяцца прыцягваць у сваю краіну вядучых замежных спецыялістаў — нашы ўкладанні потым шматразова акупяцца.

Сапраўдныя авацыі залы віцэ-прэм'ер сарваў, калі агучыў сваё бачанне праблемы перагрузак амбулаторна-паліклінічнага звяна:

— Вы кажаце, што трэба штосьці рабіць з чэргамі ў паліклініках. У нас у сярэднім на аднаго жыхара прыпадае больш як 13 наведванняў паліклінік за год, а ў суседніх краінах зусім іншая статыстыка — 6 ці 6,5 наведвання на аднаго жыхара... Давайце ўвядзем плату ў памеры 5 тысяч рублёў за наведванне паліклінікі. Нават калі памножыць 5 тысяч рублёў на сярэдні паказчык па колькасці наведванняў, то за год выйдзе невялікая сума. Затое кагосьці нават такая сімвалічная плата, магчыма, прымусіць задумацца: а ці сапраўды трэба звяртацца ў паліклініку?

На думку Анатоля Тозіка, у сродках масавай інфармацыі недастаткова ўвагі надаецца прапагандзе здаровага ладу жыцця:

— Я заўважыў, што чым больш мы змагаемся з алкагалізмам, тым больш нашы людзі п'юць. Толькі задумайцеся: у сярэднім на кожнага беларуса прыпадае ў год больш як 13 літраў абсалютнага алкаголю. Калі адкінуць старых і немаўлят, то атрымліваецца, што на кожнага беларуса прыпадае 130 бутэлек гарэлкі! Кожны год мы нясём вялізныя страты насельніцтва ў выніку суіцыдаў, атручэнняў алкаголем, гібелі на вадзе, дарожна-транспартных здарэнняў, трагічных выпадкаў на вытворчасці. Размова ідзе пра 15 тысяч чалавек, прычым пераважная большасць гэтых людзей знаходзіцца ў працаздольным узросце. Таму я усіх папрасіў бы вельмі адказна паставіцца да выканання мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Да 2015 года мы павінны спыніць дэпапуляцыю насельніцтва. Пачынаючы з 1994 года, насельніцтва Беларусі скарацілася ўжо на 800 тысяч чалавек. І летась нам удалося толькі крыху затармазіць тэмпы дэпапуляцыі...

Віцэ-прэм'ер папрасіў кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя разгледзець магчымасць стварэння навукова-практычнага цэнтра, які б прафесійна займаўся эканомікай галіны.

— Нам трэба навучыцца лічыць бюджэтныя грошы. У ахове здароўя, як, дарэчы, і ў іншых бюджэтных сферах, ніхто толкам грошы лічыць не ўмее, паколькі грошы — не свае... І галоўная задача кіраўнікоў заключаецца толькі ў тым, каб як мага больш сродкаў з бюджэту атрымаць. Таксама даўно наспела неабходнасць арганізацыі падрыхтоўкі спецыялістаў для абслугоўвання складанай медыцынскай тэхнікі, якая напрост звязана з эфектыўнасцю выкарыстання дарагога абсталявання. Трэба ўжо ў гэтым годзе адкрыць падрыхтоўку спецыялістаў па медыцынскай фізіцы на базе Міжнароднага экалагічнага ўніверсітэта імя акадэміка Д. Сахарава, — падкрэсліў Анатоль Тозік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ТАКІЯ ЧЭМПІЯНАТЫ НЕ БЫВАЮЦЬ СТРАТНЫМІ, ЗА ІХ ЗМАГАЮЦЦА ЎСЕ КРАІНЫ»

## У Мінгарвыканкаме расказалі пра падрыхтоўку да хакейнага першынства-2014

**Рэпетыцыяй перад чэмпіянатам свету па хакеі, які збіраецца прымаць наша сталіца ў 2014-м, стане чэмпіянат свету па велатрэку, які пройдзе на «Мінск-Арэне» ў 2013-м. Чакаецца, што на хакейнае планетарнае першынство ў сталіцу прыедзе каля 20 тысяч гасцей. На «рэпетыцыйны», велатрэкавы чэмпіянат у нашай сталіцы чакаецца каля 5 тысяч гасцей. Пра падрыхтоўку Мінска да чэмпіянату свету-2014 расказаў начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама Аляксей Пракаповіч.**

— Мы назіралі за правядзеннем чэмпіянатаў свету ў іншых краінах і маем уяўленне пра арганізацыю працы з балельшчыкамі як унутры арэн, так і за іх межамі, — паведаміў Аляксей Пракаповіч.

Упраўленне бытавога абслугоўвання склала карту-схему гасцініц, рэстаранаў, кавярняў і выязных пунктаў харчавання, інтэрнатаў і санаторна-курортных устаноў як у Мінску, так і за яго межамі, якія могуць прыняць гасцей чэмпіянату.

Адказваючы на пытанне пра фінансавыя выдаткі, якія панясе наша краіна, калі міжнародная федэрацыя хакея вырашыць перанесці планетарнае першынство ў іншую краіну, Аляксей Пракаповіч запэўніў, што вялікіх страт не будзе:

— Усе мерапрыемствы па будаўніцтве закладзены ў генплане развіцця горада. Частка, якая скарэктавана для прыняцця чэмпіянату, нязначная. Часта ў транспарце даводзіцца чуць размовы, што ўся краіна працуе на фінансаванне чэмпіянату свету 2014 года. Але гэта не так, бо фінансаванне закладзена пад рэалізацыю генплана горада. Іншая справа, што ў кожнага чалавека, сталіцы, краіны павінна быць мэта. Наша мэта — 2014 год, і мы павінны якасна падыйсці да прыёму такога турніру.

Што датычыць прыбыткаў, якія можа атрымаць наша сталіца, то Аляксей Пракаповіч не стаў называць лічбаў, але запэўніў, што такія турніры не бываюць стратнымі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ЭКСПАРТНАЯ ПОШЛІНА НА БЕНЗІН ПАВЯЛІЧАНА

Сёння Беларусь павышае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты. Такім чынам, згодна з пастановай Савета Міністраў Беларусі №184 ад 27 лютага 2012 года, вывазныя мытныя пошліны на нафту, светлыя і цёмныя нафтапрадукты значна павялічваюцца. Пошліна на бензін, напрыклад, складзе 370,1 долара ЗША за тону замест 354,3. А вось пошліна на звадкаваныя газы наадварот знізілася — 157,3 долара замест 181,7. За тону ж самой нафты трэба будзе цяпер плаціць 411,2 долара. Нагадаем, што з 1 кастрычніка 2011 года Беларусь разлічвае экспартныя пошліны на нафтапрадукцыю, якая вывозіцца за межы Мытнага саюза, гэтак жа, як і Расія: стаўка на светлыя і цёмныя нафтапрадукты звязваецца са стаўкай на нафту і складае 66% ад яе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### «ЗДАБЫЎ» ДЗІЧЫНУ... НА ПРАСПЕКЦЕ

На праспекце Пераможцаў у сталіцы пад колы машыны трапіла казуля. Як паведамляюць у прэс-службе Мінскага ДАІ, аўтамабіль «Citroen C4 Picasso» рухаўся па праспекце па трэцяй паласе. Недзе за паўкіламетра да Мінскай кальцавой, з-за машыны, што ехала па суседняй паласе, раптам выскачыла нейкая жывёліна. Як аказалася, казуля. На шчасце, з кіроўцам пасля такога неспадзяванага «палявання» ўсё ў парадку, а вось жывёла загінула. Намеснік начальніка Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Анатоль Быстроў патлумачыў, што адказнасць вадзіцель у такім выпадку нясе толькі па ДТЗ, калі гэта патрабуецца. А за казулю яму нічога не пагражае.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### КІРОЎЦА СМЕЦЦЯВОЗА НАСМЕРЦЬ ЗБІЎ ПАШТАЛЬЁНА

Трагічнае ДТЗ адбылося ўчора ў Мінску каля 9 гадзін раніцы, паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Савецкага раёна Марыя Дзьякава. Кіроўца на аўтамабілі МАЗ рухаўся па дваровай тэрыторыі вул. Беламорскай. Насупраць дома № 14 ён здзейсніў наезд на жанчыну, якая працавала паштальёнам. Жанчына ад атрыманых траўмаў памерла. Вядома, што кіроўца МАЗа 20 разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні ПДР, у тым ліку 4 разы за здзяйсненне ДТЗ, аднойчы — за знікненне з месца ДТЗ і тройчы — за язду ў нецвярозым стане.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

■ Біятлон

# МЕДАЛЬНЫ АРЫЕНЦІР

**Аматары зімовых відаў спорту могуць уздыхнуць з палёгкай. Вось і дачакаліся. Сёння ў нямецкім мястэчку Рупольдынг распачнецца 45-ы чэмпіянат свету па біятлоне. За дзесяць дзён спартсмены разыграюць 11 камплектаў медалёў.**

Беларусь на чарговым чэмпіянаце свету прэзентуюць 10 страляючых лыжнікаў. Аднак калі магчымасці мужчынскай зборнай на ўзнагароды даволі туманныя, дык дзяўчаты, падапечныя Андрыяна Цыбульскага і Клауса Зіберта, маюць даволі добрыя шанцы паспрачацца за медалі. Першнаперш гэта тычыцца галоўнай нашай надзеі на спаборніцтвах Дар'і Домрачавай. Для яе гэты год — лепшы ў кар'еры. Мяркуйце самі, у гэтым сезоне Дар'я ўжо паспела 14 разоў трапіць у тройку прызёраў! У агульным заліку Кубка свету Домрачава займае пакуль другі радок. Апераджае Кайсу Мякарайнен, Вольгу Зайцаву, Туру Бергер, саступае ў рэйтынгу толькі двухразовай алімпійскай чэмпіёнцы з Германіі Магдалене Нойнер. Будзем чакаць сюрпрызаў і ў эстафеце. Падставы на гэта ёсць: на нядаўнім этапе Кубка свету ў італьянскай Антэрсельве жаночая чацвёрка (Надзея Скардзіна, Людміла Калінчык, Настасся Дубарэзава і Дар'я Домрачава) заваявала «серабро».

Калі сярод дзяўчат з нецярпеннем чакаюць працягу дуэлі Нойнер — Домрачава, сярод мужчын галоўнымі прэтэндэнтамі лічаць нарвежца Эміля Хегле Свендсана, француза Мартэна Фуркада і немца Андрэаса Бірнбахера.

Паназіраць за выступленнямі зорак сусветнага біятлона можа кожны ахвотны. Белтэлерадыёкампанія, па традыцыі, не абышла ўвагай біятланістаў.

— Напэўна, усе гонкі чэмпіянату свету будуць трансклявацца ў жывым эфіры. Біятлону зараз аддаецца перавага, — зазначыў намеснік дырэктара дырэкцыі спартыўнага вяшчання Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Казюкевіч. — Каментаваць спаборніцтвы будуць Святлана Парамыгіна, Уладзімір Навіцкі і я.

Першая трансляцыя адбудзецца ўжо сёння на тэлеканале «Беларусь-2». У 17:30 дадуць старт змешанай эстафеце. Не прапусціце!

**Тарас ШЧЫРЫ**

**СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ ЗБОРНАЙ**

**Мужчыны:** Сяргей Новікаў, Яўген Абраменка, Юрый Лядаў, Уладзімір Аляніішка, Аляксандр Бабчын.

**Жанчыны:** Дар'я Домрачава, Настасся Дубарэзава, Людміла Калінчык, Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко.

■ Лыжка дзёгцю

# ЗА НЯБОЖЧЫКАЎ АДКАЖУЦЬ



**Напярэдадні прафесійнага свята — Дня беларускай міліцыі — начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама генерал Валерый Палішчук паабяцаў... звольніць 27 супрацоўнікаў. Усе яны маюць дачыненне да так званай «труннай справы». Служба ўласнай бяспекі праверыла працу ўчастковых інспектараў у Гомелі і Мазыры. Высветлілася, што некаторыя з іх за пэўнае ўзнагароджванне паведамлялі пра нябожчыка фірмам, якія займаюцца рытуальнымі паслугамі.**

— Гэтая тэма была актуальная і дагэтуль, — адзначыў генерал Палішчук. З гады таму аднаго з супрацоўнікаў міліцыі, маёра, звольнілі за падобную дзейнасць ціха, без артыкула. Пасля чаго ён сам пайшоў працаваць у рытуальны бізнэс і «падцягнуў» да сябе памочнікаў — участковых. Аднаго з іх затрымалі ў момант, калі ён атрымліваў 250 тысяч ад прадпрымальніка, які займаецца рытуальнымі паслугамі. Аднак за аператыўную інфармацыю пра тое, што чалавек памёр, грошы атрымліваюць і прадстаўнікі іншых службаў, у тым ліку медыкі.

Увогуле ж летась з органаў унутраных спраў Гомельскай вобласці было звольнена больш за 340 чалавек. 87 з іх — за здзейсненыя злачынствы ці парушэнні законнасці. У дачыненні да міліцыянераў было заведзена 5 крымінальных спраў (у прыватнасці, за хабар, за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць). Дарэчы, у 2010 годзе крымінальных спраў у дачыненні да гомельскіх міліцыянераў было заведзена ў тры разы больш — 15.

— Магчыма, такіх выпадкаў і няшмат, але яны ёсць, і надалей мы будзем пазбаўляцца ад нядобрасумленных работнікаў. Да прыкладу, у некаторых раёнах супрацоўнікі паведамляюць, што правялі работу з насельніцтвам. Правяраем у Лоеўскім раёне — высвятляецца, што па паперах участковы праводзіў прыём адначасова ў двух сельсаветах. Таксама сорамна за Рагачоў: у цэнтры горада з няведама якой зброі былі расстраляны дарожныя знакі — і ніхто гэтым не займаўся!

Валерый Палішчук крытычна адносіцца да працы свайго ўпраўлення. Статыстыка сведчыць, што за апошнія 20 гадоў на Гомельшчыне не раскрытымі застаюцца 284 забойствы, але іх пік прыйшоўся на 1996-98 гады (па 25-30 злачынстваў). А вось летась і пазалетась засталіся пакуль нераскрытымі толькі па адным забойстве. Колькасць злачынстваў прыкметна зменшылася — на 2,5 тысячы ў параўнанні з 2010 годам. Адначасова ўзрасла і іх раскрывальнасць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Фота аўтара**

## ЧАМУ КУРС УПАЎ І ЦІ БУДЗЕ ЁН РАСЦІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Перапрацаваўшы гэтую сыравіну, мы прадаём яе Заходняй Еўропе. А ў сувязі з тым, што Іран адмовіўся пастаўляць туды нафтавыя рэсурсы, цэны на нафту сталі расці. У сваю чаргу, і цэны на бензін падняліся. Таму атрымалася, што гэты квартал у нас вельмі спрыяльны: гандлёвае сальда з Еўрасаюзам значна вырасла і стала дадатным — а значыць, і валюты стала паступаць у нашу краіну больш. А калі паступае валюта, то долар і еўра не будуць расці. Але вельмі рэзкае падзенне долара таксама недапушчальна: гэта кепска паўплывае на нашых ненафтавых экспарцёраў з-за падаражання прадукцыі. У лепшым выпадку трэба спыніць курс на 8000 рублёў за долар.

**Сяргей ЧАЛЫ, эканамічны аналітык:**

— Зніжэнне курсу мы назіраем ужо даўно. Рынак так працуе. Мы ж маем курс, які плавае, бо ён залежыць ад попыту і прапановы. Валюты сталі прадаваць больш — вось курс і пайшоў уніз. Таму гэтак жа, як паніжацца, павышацца курс таксама можа. Пытанне толькі: чаго знянацку гэта адбудзецца? Я не бачу пакуль асаблівых прычын. Увогуле, трэба прызвычаіцца да таго, што курс можа пайсці і ў той, і ў іншы бок, каб гэтага не баяцца.

І сапраўды так: ужо ўчора і долар, і еўра, і расійскі рубель умацаваліся адносна беларускай валюты.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Ходзяць чуткі, што...

## ЗА ПРАЖЫВАННЕ Ў НЕПРЫВАТЫЗАВАНЫХ КВАТЭРАХ МОГУЦЬ УВЕСЦІ АРЭНДНУЮ ПЛАТУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Наталля Качан паведаміла карэспандэнту «Звязды», што і ў дзейным заканадаўстве існуе норма, якая прадугледжвае плату ўласніку за карыстанне жылымі памяшканнямі. Праўда, гэта норма сёння не дзейнічае, бо выкарыстоўваецца нулявы тарыф гэтай платы. А згодна з праектам новага жыллёвага Кодэкса, наймальнікі вымушаны будуць плаціць уласніку жылля дадаткова рэальныя грошы. Калі гэта адбудзецца і пра якія памеры платы можа ісці рэч? Наталля Качан на гэтыя пытанні пакуль адказаць не можа, бо жыллёвы Кодэкс павінны прыняць дэпутаты, а ў народных выбраннікаў да гэтага праекта яшчэ застаюцца пытанні. Больш за тое, пасля прыняцця гэтага дакумента міністэрству даецца 6 месяцаў на распрацоўку адпаведных інструкцый жыллёва-камунальным структурам.

**Сяргей КУРКАЧ**

## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў сакавіку

**2**, пятніца, 12.00 — 14.30
**4**, нядзеля, 21.00 — 22.00
**7**, серада, 0.30 — 2.30
**8**, чацвер, 8.30 — 23.00
**9**, пятніца, 0.00 — 4.00
**11**, нядзеля, 2.00 — 4.30
**12**, панядзелак, 17.30 — 24.00
**13**, аўторак, 0.00 — 6.00
**15**, чацвер, 6.30 — 9.30
**17**, субота, 12.00 — 15.00
**19**, панядзелак, 19.30 — 24.00
**21**, серада, 7.30 — 22.30
**22**, чацвер, 0.00 — 9.00
**24**, субота, 16.30 — 20.30
**27**, аўторак, 3.30 — 9.30
**29**, чацвер, 17.00 — 22.00

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР ПАГАДЗІЛАСЯ ЎВЕСЦІ ЯДЗЕРНЫ МАРАТОРЫЙ

КНДР пагадзілася ўвесці мараторый на выпрабаванні ядзернай зброі, запускі ракет далёкага радыуса дзеяння, а таксама спыніць работы па ўзбагачэнні ўрану, паведамілі ў Дзярждэпе ЗША. Акрамя таго, улады Паўночнай Карэі пагадзіліся дапусціць міжнародных інспектараў па ядзернай бяспецы на свой найбуйнейшы ядзерны аб'ект.

### УГА ЧАВЕСУ ВЫДАЛІЛІ ПУХЛІНУ НА КУБЕ

Па неафіцыйнай інфармацыі, аперацыю праводзілі медыкі гаванскай клінікі «Сімек», доўжылася яна паўтары гадзіны. Інфармацыі аб стане Уга Чавеса пакуль не паступала.

### ВА УКРАІНЕ ДА ЕЎРА-2012 З'ЯВЯЦЦА ДВУХПАВЯРХОВЫЯ ЦЯГНІКІ

Ва Украіне да Еўра-2012 з'явяцца чэшскія двухпавярховыя цягнікі. Згодна з заключаным дагаворам паміж Паўднёвай чыгункай Украіны і кампаніяй Skoda, прадугледжана набыццё 2-х двухсістэмных двухпавярховых электрацягнікоў. Новы рухомы састаў украінскія чыгуначнікі плануюць задзейнічаць па маршруце Харкаў—Кіеў—Данецк.

### ТЫСЯЧЫ ЧЭШСКІХ СТУДЭНТАЎ ВЫСТУПІЛІ СУПРАЦЬ ПЛАТНАЙ АДУКАЦЫІ




Сем тысяч студэнтаў прынялі ўдзел у акцыі пратэсту супраць рэформы адукацыі, якая прадугледжвае ўвядзенне платы за навучанне і павышэнне колькасці прадстаўнікоў урада ў адукацыйных установах. Прапанаваныя ўрадам захады, на думку студэнтаў і кіраўніцтва ўніверсітэтаў, абмяжуюць акадэмічныя свабоды.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПУЦІН ЛІЧЫЦЬ НЕДАПУШЧАЛЬНЫМІ І БЕССЭНСОЎНЫМІ САНКЦЫІ ЕС У АДНОСІНАХ ДА БЕЛАРУСІ



Прэм'ер РФ Уладзімір Пуцін назваў недапушчальнымі і бессэнсоўнымі санкцыі, уведзеныя Еўрасаюзам у адносінах да Беларусі, паведамляюць інфармагенцтвы.

«Што датычыцца санкцый, вы ведаеце нашы агульныя адносіны да ўсякіх санкцый. Як правіла, яны, як мінімум, неэфектыўныя», — сказаў Уладзімір Пуцін на сустрэчы з даверанымі асобамі, прадстаўнікамі Агульнарасійскага народнага фронту (АНР) і палітолагамі. Паводле слоў расійскага прэм'ера, неэфектыўнасць санкцый у канчатковым выніку прыводзіць да інтэрвенцыі. Гэта, безумоўна, элемент сілавога націску.

Разам з тым, Пуцін заявіў, што канфлікт паміж Бруселем і Мінскам ніяк не паўплывае на ход інтэграцыйных працэсаў паміж Расіяй і Беларуссю. На яго думку, санкцыі з боку ЕС не з'яўляюцца «замахам» на Мытны саюз і Адзіную эканамічную прастору, а знаходзяцца ў сферы двухбаковых адносін Еўрасаюза і Беларусі. Кіраўнік урада падкрэсліў, што такая сітуацыя тым не менш выклікае шкадаванне. «Мы шкадуем аб гэтым, спадзяёмся, што рана ці позна нармалізацыя настане паміж Еўрасаюзам і Беларуссю, але гэта ніяк не паўплывае на ход нашых інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай прасторы», — адзначыў Уладзімір Пуцін.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ШЧУПАК — НА НЕРАСТ

**Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 1 па 31 сакавіка на лоўлю звычайнага шчупака ўстаноўлена забарона.**

Пра гэта паведаміў **дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслліннага свету Вадзім ВАРАБЕЙ**. — За здабычу шчупака ў забаронены перыяд правапарушальнікі могуць прыцягвацца да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці — у залежнасці ад характару правапарушэння.

У адпаведнасці з артыкулам 15.35 Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб адміністрацыйных правапарушэннях», за здабычу рыбы ў забаронены час прадугледжаны штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь (350—1750 тысяч рублёў) з канфіскацыяй прылад здабычы рыбы ці іншых водных жывёл і іншых прадметаў, якія з'яўляюцца прыладамі ці сродкам здзяйснення ўказанага парушэння.

### ЭВАКУЯВАЛІ 320 ЧАЛАВЕК

**За паўгадзіны да поўначы сталічным выратавальнікам стала вядома пра пажар у 9-павярховым будынку інтэрната Мінскага дзяржаўнага энергетычнага каледжа на вуліцы Ваўпшасава. Тут адбылося загаранне ў жылым пакоі на другім паверсе.**

Работнікі МНС эвакуявалі 320 чалавек. Выратавалі трох: двух чалавек (яны не пацярпелі) з кабіны ліфта, які спыніўся на ўзроўні другога паверха, і з трэцяга паверха з дапамогай маскі — навучэнца 4 курса каледжа, які з дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» быў шпіталізаваны. Таксама на ўстанову аховы здароўя з тым жа дыягназам даставілі жонку наймальніка пакоя, дзе адбылося ўзгаранне, і дваіх дзяцей: сына 2010 года нараджэння і дачку 2008 года нараджэння. Пасля аказання дапамогі маці і дзяцей адпусцілі дадому. Прычына пажару высвятляецца, на месцы працуе аператыўная група.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАН ВОН СІК:

# «ЧЫМ БОЛЬШ ЖЫВУ Ў МІНСКУ, ТЫМ БОЛЬШ ЗНАХОДЖУ АГУЛЬНАГА ПАМІЖ НАШЫМІ НАРОДАМІ»

## На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Карэя ў Беларусі Кан Вон Сік



**— Спадар пасол, узгадваючы халодныя дні гэтай зімы, хацелася б і першае пытанне задаць адпаведнае: як вы і супрацоўнікі пасольства, жыхары Паўднёвай Карэі, пераносіце такія суровыя мінусавыя тэмпературы?**

— Так, мы з Паўднёвай Карэі, але гэта не значыць, што мы не ведаем, якія бываюць моцныя маразы. У Карэі (хоць яна і Паўднёвая), нагадаю вашым чытачам, выразна прадстаўлены ўсе чатыры пары года. І зіма, дарэчы, бывае часам даволі суровая. У паўночных рэгіёнах краіны тэмпература можа зніжацца да мінус 20. Амаль 70 працэнтаў тэрыторыі Карэі займаюць горы, і там таксама бывае вельмі зімна — нярэдка на вышыні да мінус 30 і ніжэй. Тым не менш, альпінізм, катанне на горных лыжах, пешыя прагулкі па заснежаных гарах вельмі папулярныя сярод карэйцаў. Так што мы — народ загартаваны. І вашы маразы, сумёты нас не палохаюць і не перашкаджаюць у працы. У 2018 годзе ў Карэі пройдуць зімовыя Алімпійскія гульні. Хочацца спадзявацца, што і тая зіма будзе снежнай і ў меру марознай.

**— Днямі ў мінскім Доме дружбы адбылася ўрачыстая вечарына з нагоды 20-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Карэя. Якія падзеі за гэты перыяд вам запомніліся асабліва?**

— Сярод палітычных падзей я вылучыў бы візіт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Сеул у 1997 годзе і візіт прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага ў 2007 годзе. З пачатку ўсталявання дыпламатычных адносінаў было падпісана каля 20 міжурадавых пагадненняў, якія сталі базай для развіцця беларуска-карэйскага супрацоўніцтва ў розных сферах. За 20 гадоў праклалі «сцежкі» адзін да аднаго прадстаўнікі дзелавых колаў і ўжо вядуць рэгулярны абмен дэлегацыямі, прапрацоўваюць сумесныя праекты. Абедзве краіны зацікаўлены ў далейшым развіцці ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Завязаліся плённыя кантакты паміж сталіцамі, навукоўцамі, наладжаны культурныя і гуманітарныя кантакты, сувязі ў сферы адукацыі, спорту, турызму.

Мне таксама прыемна адзначыць, што і на міжнароднай арэне нашы краіны па многіх пытаннях часта займаюць аналагічную пазіцыю, напрыклад, у ААН, іншых уплывовых арганізацыях, падтрымліваюць адна адну на розных форумах.

**— Тавары з Паўднёвай Карэі сталі ўжо звыклай з'явай у гандлёвых сетках Беларусі: бытавая тэхніка, мабільныя тэлефоны, легкавыя аўтамабілі і шмат яшчэ чаго. А якія беларускія прадукты шырока вядомыя ў вашай краіне?**

— Мы імпартуем з Беларусі калійныя ўгнаенні, прадукты хіміі, інтэгральныя мікрасхемы, паўправаднікі, пэўныя камплектуючыя для нашай электроннай прамысловасці. У 2010 годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Паўднёвай Карэяй дасягнуў 164 мільёнаў долараў ЗША. У параўнанні з патэнцыялам гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва нашых краін аб'ём двухбаковага гандлю пакуль не дасягае жаданых паказчыкаў. Па выніках мінулага года Карэя заняла 9-е месца ў свеце па аб'ёме знешняга гандлю, які перавысіў 1 трыльён долараў ЗША. У сваю чаргу, беларуская эканоміка на сённяшні дзень займае 61-е месца ў свеце па аб'ёме валавога ўнутранага прадукту (ВУП). Беларусь таксама знаходзіцца на 69-м месцы ў рэйтынгу краін па ўмовах вядзення бізнэсу (Doing Business) і на 65-м месцы па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу (UNDP). Прымаючы да ўвагі гэтыя важкія эканамічныя дасягненні нашых краін, напрошваецца выснова: на сённяшні дзень абмен паміж дзвюма краінамі знаходзіцца на нізкім узроўні. Разам з тым, ёсць усе шанцы для бурнага развіцця ўзаемавыгадных адносін і ўмацавання супрацоўніцтва.

**— Умовы і перспектывы для гэтага ёсць. Але няма пакуль шырока зваротнай таварнай плыні з Беларусі. Чым вытворцы нашай краіны могуць зацікавіць карэйцаў? Можа, таварамі шырокага ўжытку?**

— Хочацца адзначыць, што ў апошні час карэйцы надаюць вялікую ўвагу экалагічна чыстым прадуктам, карысным для здароўя. У гэтай сувязі натуральныя прадукты харчавання з Беларусі, якія выпускаюцца без дабаўлення залішняй колькасці кансервантаў, на мой погляд, змаглі б заваяваць значную папулярнасць у Карэі. Таксама ў нас вельмі паспяхова развіваецца лёгкая прамысловасць, і карэйскія вытворцы адзення ўсё больш імкнуцца выкарыстоўваць натуральныя валокны і тканіны. У гэтым накірунку цікавым уяўляецца супрацоўніцтва па закупе і перапрацоўцы беларускага льну, які славіцца сваёй якасцю і ўмеранымі цэнамі. У цэлым хачу сказаць, што спажывецкі рынак Паўднёвай Карэі вельмі шырокі і разнастайны.

Але для таго, каб дакладна вызначыць, якія беларускія тавары будуць канкурэнтаздольнымі і папулярнымі ў Карэі, вашым вытворцам неабходна самастойна праводзіць дэталёвы маніторынг і аналіз карэйскага рынку. Таксама можна выкарыстаць вельмі распаўсюджаны ў Карэі гандаль праз інтэрнэт. Што датычыць ініцыятыў з карэйскага боку, то летась Беларусь наведала дэлегацыя Карэйскай асацыяцыі імпарцёраў (KOIMA). На долю гэтай арганізацыі прыходзіцца 80 працэнтаў усяго імпарту ў Рэспубліку Карэя. У час беларуска-карэйскага бізнэс-семінара, які быў спецыяльна прымеркаваны да візіту дэлегацыі, адбыліся перамовы аб імпарце і экспарце такой прадукцыі, як масла для аўтамабіляў, поліэтыленавае валакно, лесаматэрыялы, сухое малако, гатовая малочная прадукцыя і іншыя. Я магу сказаць, што карэйскія бізнэсмены даюць вельмі станоўчую ацэнку па выніках праведзеных перамоў. Думаю, што гэтыя іх візіт адкрые перспектывы для росту ўзаемнага гандлю паміж дзвюма краінамі ў будучыні.

**— Чым і як нам зацікавіць карэйскі вялікі бізнэс, каб ён прыняў стратэгічнае рашэнне аб значных інвестыцыях у беларускую эканоміку?**

— Я лічу, што для гэтага адпаведная трывалая заканадаўча-прававая база ўжо закладзена. Я на свае вочы бачыў, як плённа і эфектыўна працуюць вашы свабодныя эканамічныя зоны, якія створаны ў кожным рэгіёне Беларусі. Наколькі я разумею, ваш бок гатовы для ўзаемавыгаднага двухбаковага супрацоўніцтва. Што яго стрымлівае? Хутчэй за ўсё, яшчэ недастатковае веданне адзін аднаго, таксама недастатковае разуменне патэнцыяльнымі партнёрамі тых мэт і задач, якія ставяць перад сабой беларускія і карэйскія кампаніі. Адсюль і не зусім часам правільнае ўяўленне аб іх магчымасцях. Таму наша пасольства ў Мінску бачыць сваёй асноўнай задачай распаўсюджванне сярод карэйскіх фірмаў аб'ектыўнай і поўнай інфармацыі аб перспектыўных для іх увагі беларускіх прадпрыемствах.

У нас у свой час пры вывучэнні практыкі сучаснага менеджменту з'явіўся тэрмін «стратэгія блакітнага акіяна». Калі казаць спрошчана, то трэба шукаць тыя вытворчыя нішы, дзе пакуль нізкая канкурэнцыя і адначасова вялікая перспектыва заняць лідзіруючыя пазіцыі на рынку. Я перакананы ў тым, што для карэйскіх кампаній супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі можа стаць сапраўдным «блакітным акіянам». Мы можам разам з вамі ажыццявіць вялікія праекты, стварыць новыя вытворчасці, аналагаў якіх у Беларусі і суседніх краінах няма. Новыя прадукты можна будзе з поспехам прасоўваць у Еўропе, у тых ж Казахстане і Расіі, з якімі вы знаходзіцеся ў Адзінай эканамічнай прасторы.

У Беларусі вельмі зручнае геаграфічнае становішча паміж Расіяй і Заходняй Еўропай. Акрамя гэтага, добрая інфраструктура, еўрапейскага ўзроўню дарогі, прымальныя цэны на энерганосьбіты, працалюбівыя і кваліфікаваныя кадры. Гэта важкія прычыны для стварэння ў вас сучасных сумесных прадпрыемстваў з удзелам карэйскага капіталу.

Мне здаецца, што вельмі эфектыўным было б шырокае ўзаемадзеянне вялікіх прадпрыемстваў-флагманаў Беларусі і Карэі. Эканомікі нашых краін у многім падобныя па структуры, вытворчай спецыфікацыі, яны адкрытыя і маюць выразную экспартную накіраванасць. Больш за тое, яны могуць стаць узаемадапаўняльнымі і тым самым істотна павысіць канкурэнтаздольнасць выпускаемай прадукцыі ў машынабудаванні, энергетыцы, хімічнай прамысловасці, інфармацыйных тэхналогіях, электроніцы, транспарце, будаўніцтве.

**— Я з вамі поўнасцю згодны ў тым, што мы яшчэ вельмі мала ведаем адзін пра аднаго. Яно і зразумела: велізарная адлегласць паміж нашымі краінамі, адсутнасць свежай і аб'ектыўнай інфармацыі. Пра эканамічныя дасягненні вашага народа мы добра дасведчаныя. А вось пра рысы нацыянальнага характару — амаль не. У тэлерэпартажах аб Паўднёвай Карэі часам можна ўбачыць масавыя дэманстрацыі грамадзян і бурныя спрэчкі дэпутатаў у парламенце. З гэтых рэпартажаў напрошваецца выснова, што карэйцам уласціва ўступаць у палеміку адзін з адным. Ці так гэта? Якія нацыянальныя рысы характэрныя для карэйскага народа?**

— На самай справе карэйцы не забіякі. Карэйцы, дарэчы, як і беларусы, ніколі не вялі захопніцкіх войнаў, не разбуралі суседнія тэрыторыі, не знішчалі людзей іншай нацыянальнасці. За амаль пяцітысячную гісторыю сваёй нацыі карэйцы пастаянна знаходзіліся ў коле ўплывовых і часам агрэсіўных дзяржаў, а таму былі вымушаны пастаянна абараняцца ад нападаў звонку. І, натуральна, у падобных умовах у нас развіўся магутны патрыятызм і любоў да сваёй Айчыны. Тыя эпізоды хронікі, што вы бачылі па тэлебачанні, — гэта таксама сведчанне імкнення карэйцаў абараніць сваю годнасць, справядлівасць, свае правы. Гэта, калі хочаце, своеасаблівая праява патрыятызму. Карэйцы заўсёды былі стараннымі працаўнікамі. Відаць, і па гэтай прычыне таксама сталі аўтарамі «эканамічнага карэйскага цуду».

Як часовы жыхар вашай краіны, я маю магчымасць штодзень параўноўваць карэйцаў і беларусаў. І чым больш жыву ў Мінску, тым больш знаходжу агульнага паміж нашымі народамі. Карэйцы міралюбівыя, талерантныя і спагадлівыя людзі, як і беларусы — хутчэй схільныя да кампрамісу, чым да канфлікту. Я шмат сустракаюся з вашымі людзьмі і заўсёды адчуваю іх дабрыню і сардэчную цеплыню. Карэйцы і беларусы павінны лепш ведаць адзін аднаго і сябраваць.

**— Бадай, самы правераны шлях да гэтага — узаемны турызм. Як ажывіць яго, істотна актывізаваць, каб на рэгулярнай аснове турыстычныя групы з абедзвюх краін сталі звыклай з'явай, скажам, на вуліцах Мінска і Сеула?**

— Пакуль масавым турызм у абодва бакі цяжка назваць: усяго каля тысячы чалавек за год. Гэта вельмі мала. Асабліва калі ўлічыць, што ў Карэі даволі высокі ўзровень жыцця і мае суайчыннікі падарожнічаюць па ўсім свеце, маюць магчымасць наведваць самыя аддаленыя куткі планеты. На жаль, яны зрэдку прыязджаюць у Беларусь. Прычын гэтаму некалькі, але асноўная — тая ж самая: вашу краіну мала ведаюць. Але, упэўнены, з часам Беларусь, як і яе суседзі, будзе запатрабаваная замежнымі турыстамі. У тым ліку і з Паўднёвай Карэі. У вас прыгожая і маляўнічая прырода, хутка развіваецца турыстычная інфраструктура, выдатныя шляхі зносін з еўрапейскімі сталіцамі.

З іншага боку, беларусы не пашкадуюць, калі набудуць турыстычны тур у Паўднёвую Карэю. Там яны ўбачаць непаўторныя помнікі старажытнага дойлідства, сустрэнуцца з багатай гістарычнай спадчынай майго народа, адпачнуць на цудоўным марскім узбярэжжы ці ў гарах.

Каб узаемныя паездкі былі больш зручнымі, сёння дыпламаты абедзвюх краін працуюць над спрашчэннем візавага рэжыму.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## Медыяпрастора

### «ПЛАНЕТА»

Галоўная тэма лютаўскага нумара «Планеты» — палітычная сітуацыя ў Шатландыі, у якой сёння, як ніколі, моцны сепаратысцкі настрой. Таксама аўтары артыкулаў узнімаюць пытанне абароны аўтарскага права ў інтэрнэце, распавядаюць пра наступствы надзвычайных маразоў, якія перажыла ў гэтым годзе Еўропа, знаёмяць з асобай новага прэзідэнта Фінляндыі.




Для тых, каго цікавіць навука і ўласнае здароўе, «Планета» прапануе матэрыялы, прысвечаныя таямніцам чалавечага мозга, а таксама сучасным медыцынскім тэндэнцыям, і інтэрв'ю з кіраўніком Рэспубліканскага цэнтра трансплантологіі Алегам Румо. Для аматараў гісторыі ў часопісе ёсць цэлы шэраг матэрыялаў — ад археалагічных даследаванняў на роднай беларускай зямлі да загадак таямніцах пірамід, збудаваных жыхарамі старажытнага Кітая. А жанчын вельмі зацікавіць, адкуль з'явілася парфумерыя, якой яны карыстаюцца кожны дзень. Зацікавіць «Планета» і аматараў падарожжаў. У гэтым нумары яны даведаюцца пра гісторыю некаторых геаграфічных адкрыццяў і нават «закрыццяў», а таксама пазнаёмяцца з чарговай экзатычнай краінай — Парагваем.

**Таццяна ЛАМАНАВА**

### «БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»

Ці чакае Расію «Перабудова №2»? Гэтым пытаннем задаліся журналісты часопіса «Беларуская думка» і паспрабавалі знайсці на яго адказ у размове з шэрагам вядомых расійскіх экспертаў, якая апублікавана ў лютаўскім нумары папулярнага беларускага выдання.




Сярод іншых матэрыялаў 2-га нумара «Беларускай думкі» за гэты год, якія, без сумнення, зацікавяць чытача, — інтэрв'ю «Шляхам любові і духоўнасці» з сёлетнім лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» архіепіскапам Навагрудскім і Лідскім Гурыем і «Ліпавых вучоных нам не трэба» са старшынёй Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатолем Афанасьевым, а таксама артыкул «Больш, чым брэнд», у якім асвятляецца дзейнасць вядучага прадпрыемства машынабудаўнічага комплексу нашай краіны ААТ «Беларускі аўтамабільны завод». У сваім артыкуле «Беларуская АЭС у гарадскай думцы» кандыдат сацыялагічных навук Міхаіл Хурс аналізуе вынікі сацыялагічнага маніторынгу грамадскай думкі па праблеме развіцця энергетычнай галіны нашай краіны.

**Сяргей ГАЛОЎКА**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
№ 5 (15691) 1 САКАВІКА 2012 г. ЧАЦВЕР



## Топ-5 самых арыгінальных хобі ў Беларусі

**Калі ты лічыш, што вышыванне крыжыкам і дзюдо — самае распаўсюджанае хобі, то ты не сочыш за модай. Зараз беларуская моладзь актыўна пераймае еўрапейскія тэндэнцыі, мае новыя цікавыя захапленні, што, безумоўна, суправаджаецца поспехамі.**

Вось што паказала апытанне 40 актыўных беларусаў ва ўзросце ад 17 да 27 гадоў.

Пятае месца займаюць настольныя гульні. Так, але менавіта яны, а не камп'ютарныя, адкрылі рэйтынг. Зараз у Мінску каля 10 варгеймерскіх клубаў, шмат аматарскіх гурткоў папулярнай гульні «Мафія» і... амаль кожная зацікаўленая кампанія гуляе ў «Манаполію» ці «Уно».

**Асаблівасці хобі: размовы размовамі, а адчуць дух спаборніцтва і сапраўднага азарту з любімай кампаніяй — значнае набыццё.**

Чацвёртае месца смела займаюць зімовыя віды спорту — сноўборд і лыжы. Па-першае, калі ты вырашыш стаць на дошку і праехацца па снезе, цябе падтрымаюць знаёмыя і сябры, якія ўжо маюць вопыт. І, па-другое, тэорыя прадстаўлена ў інтэрнэце.

**Асаблівасці хобі: набыць сноўборд на сайтах аматараў можна танней, чым у магазіне. Тым больш, што яшчэ месяц-другі — і пачнецца сезон для ўсіх сноўбардыстаў.**

Трэцяе месца займае здымка фільмаў. Не, не трэба дарагіх прадзюсараў і знакамітых акцёраў. Галоўнае ў кадры — гэта ты і твае сябры. Узнікла хобі некалькі гадоў таму сярод кінааматараў. Атрымала другое дыханне пасля фільма Стывена Спілберга «Супер 8».

**Асаблівасці хобі: сцэнарыем да фільма можа стаць і любімая кніга, і гісторыя суседа з дома нумар тры. Неабходнае абсталяванне — камера фотаапарата ці мабільны тэлефон. Цікавыя карціны можна адправіць у Еўропу на аматарскія кінафестывалі.**

Другое месца займае катанне на скейтбордзе. Але не нагамі, а пальцамі рук. Цікава? Называецца хобі — фінгербордынг. Як можна катацца пальцамі? Гэта магчыма, але патрэбна практыка. Больш за тое, можна набыць спецыяльныя горкі і трампліны.

**Асаблівасці хобі: у адрозненне ад траўманебяспечнага скейта, фінгербордынг не стане прычынай гіпсу.**

А вось самае новае хобі сярод моладзі Беларусі — дызайнерскія вінілавыя цацкі, ці проста «Урбан Вініл». Калекцыйныя некаляровыя больш размалёўваюцца алоўкамі, чарніламі ці фарбамі. Робяцца формы і з дрэва, і з пластыку.

**Асаблівасці хобі: размалёўваць смешнага зверачалавека можа і аматар, і майстар. Галоўнае — жаданне. І, безумоўна, сябры не застануцца без падарунка на дзень нараджэння.**

Гэты рэйтынг для тых, хто шукае цікавы занятак у свой вольны час. А калі вы ведаеце што-небудзь яшчэ больш арыгінальнае — у вашых руках зрабіць гэтае хобі больш вядомым у Беларусі.

**Ірына ДЗЯДКОЎСКАЯ.**

## Аляксандра СОКАЛ:



# «ГУЛЯЮ ПА ПРАВІЛАХ УЛАСНАГА ЖЫЦЦЯ»

**НАПЭЎНА, кожны з мінскіх аўтааматараў хоць аднойчы, але звярнуў увагу на яшчэ нядаўна даволі папулярныя ў сталіцы бігборды. На іх маладая дзяўчына гарэзліва набівае футбольны мяч і заахвочвае дзяўчат займацца спортам пад слоганам: «Жаночы футбол — модна! Прыходзь гуляць!». Яшчэ зусім маладая футбалістка Саша Сокал, якую запрасілі паўдзельнічаць у тым праекце, нават не падазравала, што праз некалькі гадоў футбол для яе завершыцца, а слова «мода» стане адным з найбольш ужывальных у цяперашнім жыцці. Але і за гэтыя некалькі сезонаў у прафесіянальным футболе яна паспела дасягнуць таго, пра што некаторыя толькі мараць. Уладальніца Кубка Беларусі ў складзе мінскай «Зоркі», майстар спорту, былы галкіпер моладзевай зборнай. Упэўнены, спіс дасягненняў Аляксандра працягне, але ўжо ў іншай сферы — у мадэльным бізнэсе.**

**— Саша, як так адбылося, што ў 20 гадоў ты засталася па-за футбольнымі межамі?**

— Так склалася ў маім жыцці, што пэўныя моманты падштурхоўвалі скончыць займацца спортам. Толькі я сама канчаткова не была ўпэўнена ў гэтым. Але давялося. Прычына досыць папулярная сярод футбалістаў — траўма калена. Каб працягнуць кар'еру, трэба было рабіць аперацыю, аднак я вырашыла зберагчы сваё здароўе.

**— І пасля...**

— Трэніравала дзяўчынак 1996-98 гадоў нараджэння (я вучуся на чацвёртым курсе БДУФК). Папрацавала з імі паўгода. У выніку мы выйгралі першынство Беларусі сярод аднагодак, пасля чаго я перадала каманду больш дасведчанаму спецыялісту.

**— Ты працавала з дзяўчатамі, якія яшчэ вучацца ў школе. А ці памятаеш, як сама ў дзяцінстве захапілася футболам? А можа, бацька ў секцыю прывёў?**

— У класе сёмым я ўвесь час гуляла з хлопцамі ў футбол, бо гульцоў не хапала. Праўда, пазней у школу завітаў трэнер Святлана Храпавіцкая, якая і прапанавала мне займацца футболам разам з дзяўчатамі. Я захапілася. Літаральна праз некалькі месяцаў ужо гуляла за каманду, а пасля ў моладзевую зборную трапіла. Я вярталася з заняткаў, казала бацькам, што выканала хатнюю працу і бегла на трэніроўку. Яны даведаліся пра футбол толькі праз тры гады, перад паездкай за мяжу.

**— І якая была рэакцыя?**

— Маці ад таго была проста шакаваная: «Як так, я нарадзіла дзяўчынку, а яна ў футбол гуляе?!». А вось тата падтрымаў мяне. А калі ў 17 я атрымала званне майстра спорту, гэта стала для яго сапраўдным гонарам за дачку.

**— А як ты апынулася ў варотах?**

— Дзякуючы трэнеру Дзмітрыю Шаўчуку. Ён убачыў мяне, мой рост і прапанаваў пагуляць у варотах. Насамрэч, мне не вельмі гэта падабалася. Гэта вельмі цяжкая і адказная праца. На той момант я сябе больш утульна адчувала ў полі. Мне здавалася, што я проста не спраўлюся з абавязкамі.

**— Калі я ўбачыў твае здымкі, дык проста не мог уявіць, якая дзяўчына мадэльнай знешнасці скача ў варотах, каб злавіць мяч.**

— Мае сябры таксама мяне не разумелі. Імкнуліся пераканаць. Казалі: навошта мне з такой знешнасцю гэты футбол? Маўляў, нішчыш сябе. Але, ведаеце, я атрымлівала ад гульні такое задавальненне, што і словамі цяжка перадаць. Гэта такі адрэналін!

**— Саша, ці прыходзілася табе плакаць з-за футбола?**

— Так, калі доктар паведаміў, што трэба заканчваць з футболам. Я доўга не ведала, што рабіць. Глядзела матчы розных каманд і проста хацела выбегчы на поле.

**— Цябе неафіцыйна прызнавалі самай прыгожай беларускай футбалісткай. Зайздрасці хапала?**

— Усе спартсмены — цярплівыя людзі, якія ведаюць сваю справу, любяць яе. Так, мы не былі лепшымі сяброўкамі, аднак падтрымлівалі адна адну. Перад намі была мэта — перамагчы. На зайздрасць не хапала часу. Наогул камунікаваць было няцяжка. Мы дзяўчаты, нас шмат што аб'ядноўвала. І нават да выбару экіпіроўкі мы падыходзілі творча.

**— Між іншым, працытую табе паўабаронца БАТЭ Філіпа Рудзіка, які неадназначна выказаўся наконт жаночага футбола: «Каму патрэбны жаночы футбол? Як там гуляюць? Трэба ісці ў падкат, а яны не коцяцца. Натуральна, зламаюць ногі, а потым каму патрэбна такая дзяўчына са зламанымі нагамі?» Ці сапраўды футбалісткам так цяжка знайсці другую палову?**

— Кожны мае права выказваць свае погляды. Але мне шкада, што Філіп сустракаў футбалістак з крывымі нагамі. Няма розніцы, кім ты працуеш — хакеістам ці прадаўцом у краме. Неабходна знайсці чалавека, які заўжды будзе падтрымліваць цябе. Нягледзячы на тое, што нехта лічыць футбалістак моцнымі целам і духам, нам таксама трэба, каб быў чалавек, на плячо якога заўжды можна абаперціся.

**— У мадэлі ты трапіла дзякуючы рэкламнаму праекту, які папулярызаваў жаночы футбол?**

— Так. І менавіта ўласны інтарэс, а не хтонебудзь падштурхнуў мяне паспрабаваць сябе ў мадэльным бізнэсе.

**— І чым ужо зараз можаш пахваліцца?**

— Я ўжо паспела паўдзельнічаць у конкурсе «Міс Мінск — 2011». Гэта сапраўды каштоўны досвед, які мне павінен спатрэбіцца і надалей. Акрамя таго, я здымалася для рэкламы банка, для сотавага аператара. Усё ў мяне яшчэ наперадзе. Хачу паспрабаваць сябе і на подыуме, і як фотамадэль. Я веру, што таленавіты чалавек будзе таленавіты ва ўсім.

**— Калі будзе магчымасць вярнуцца ў футбол, але на ўжо іншую пасаду, скарыстаешся магчымасцю?**

— Гэта цудоўна, што футбол быў у маім жыцці. Толькі я мяняюся, з'яўляюцца новыя інтарэсы, захапленні. Менавіта таму я і хачу паспрабаваць свае магчымасці ў новых для мяне сферах дзейнасці.

**— А па якіх правілах больш цяжка гуляць — футбольных ці па законах мадэльнага бізнэсу?**

— Не ведаю па якіх цяжэй, але я пераканалася ў тым, што мне працай жывецца па сваіх.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Чырвоная змена
1 03 2012 г.

# «Пакуль ты думаеш пра стандарты, дзяўчаты думаюць пра іншых хлопцаў»



**Нядаўна чытаны глянцавы друк сцвярджае, што каб перажыць сезонную хандру, патрэбна якаснае кіно, горкі шакалад і добры сябар. Мы сцвярджаем, што, каб перамыць косці розным стэрэатыпам з глянцавага друку, дастаткова толькі апошняга. Ну, хіба яшчэ стосік часопісаў не пашкодзіць, каб размова была прадметнай. І два кантрасныя погляды на пытанне, мужчынскі і жаночы, таксама варта мець на ўзбраенні. Што ж, часопісы на месцы, а сябар рвецца ў бой. Паехалі!**

### ШКОДНЫЯ ПАРАДЫ

— Ну што, шаноўны Сяржук, сёння наканавана табе выдаць усю каварную паднаготную моцнай паловы чалавецтва!

**— А што тут выдаваць? Мы — самыя простыя стварэнні ў свеце. На нас пагляд зі — і ўсё зразумела. Гэта вы, жанчыны, такія засакрэчаныя, што ніякі шпіён не справіцца. Аб чым вы думаеце, аднаму Богу вядома...**

— Ага, простыя! Вось адкажы ты мне тады: надзеў такі франт гальштук, валасы наставіў гелем, парфуму набыў нятанную. Як думаеш, што ён збіраецца рабіць?

**— Напэўна, на спатканне пойдзе. Альбо ў клуб з дзяўчатамі знаёміцца.**



— А вось і не! Начальнік пакрытыкаваў яго за неадпаведнасць высокаму статусу фірмы, дзе па калідорах швэндаюць спрэс заможныя перспектыўныя партнёры, а гэты таварыш пужае іх сваімі штанамі ледзь не вытворчасці фабрыкі «Бальшавічка». Вось і гавары тут пра вашу простасць! Гэта, між іншым, рэальны выпадак. А туды, пра што ты падумаў, ён, наадварот, ні ў якім разе так не прыйшоў бы.

**— Шмат ты ведаеш. Я, хутчэй, для прыгажуні якой-небудзь так разадзенуся. Я ж з начальнікам сваім у рэстаран не пайду.**

— Гэта ты. А цяпер ужо наш агульны знаёмы таварыш... Не, не ў рэстаран з начальнікам. Проста таварыш гэты начытаўся мужчынскага глянцавага друку, дзе акуратненькімі літаркамі значылася: «Будзь пры знаёмстве такім, які ты звычайна». Ну, там яшчэ шмат чаго «карыснага» напісана. Ты, дарэчы, як ставішся да падобных парад? Дапамаглі хоць раз?

**— Ага, дапамаглі! Дапамаглі атрымаць па карку лішні раз. Калі я (дурань!) паверыў, што трэба быць больш настойлівым!**

— Ого, якія падрабязнасці. Давай лепш пройдземся па самых «топавых» парадах ад жаночага і мужчынскага глянцавага друку. Вось я не магу без слёз чытаць рэчы накшталт «Падаруй яму незабыўны вечар: купі шампанскага, фруктаў, на шаўковых прасцінах раскідай пялёсткі руж...»

**— А я думаў, што гэта нам патрэбна так рабіць, бо мужчынам раяць тое ж самае (напэўна, у гэтых часопісах аднолькавыя аўтары:)). Так і атрымліваецца, што мы рыхтуемся да аднаго і таго ж, а пасля кожны здагадваецца, што хацеў нечага іншага...**

— Вось якраз і варта пагаварыць пра тое, пра тое самае, растранславанае ўсімі бабулькамі на ўсіх лаўках краіны: жанчынам патрэбны толькі эмоцыі, вечнае цудоўнае каханне, а гэтым гадам — толькі адно! Была ў мяне знаёмая, якая гэтую заканамернасць поўнасцю аспрэчвала. Яна такая ўся самастойная: якая сям'я і сур'ёзныя адносіны?! А вось хлопец яе надта перажываў, ой, перажываў! Ну, гэта так бабулькі розныя расказвалі. А я вось думаю: ці настолькі гэтая заканамернасць праўдзівая? Што скажа чалавек, які сёння выдасць усю каварную мужчынскую сутнасць?

**— У мяне такая «занадта самастойная» таксама аднойчы была. А пасля сышла, бо быццам мы з ёю былі розныя. Прынамсі, у яе была такая версія. Толькі вось тры месяцы яна аб гэтым не думала. І размаўляць (на што часта вы скардзіцеся) нам было аб чым — па некалькі гадзін, а то і больш. Кожны з нас (мужчын і жанчын) можа заняць адпаведную пазіцыю. Але ж і разумець гэта можна па-рознаму.**

### У ПОШУКАХ ІДЭАЛУ

— Я вось думаю: ужо, лічы, вырасла пакаленне хлопчыкаў, якія дзякуючы рэкламе ведаюць, што, напрыклад, тоўстая дзяўчынка — гэта непрыгожа, што доўгія ногі і пэўны памер бюста — гэта абавязковыя ўмовы існавання асобы жаночага полу. А вось цікава, калі мужчына сутыкаецца з тым, што рэкламны і часопісны ідэал — вынік працы журналістаў, але ніяк не прыроды, як гэта ўспрымаецца?

**— Са смуткам, вядома. Ідзеш па вуліцы, а там замест вытанчаных паўголых (а часам і амаль цалкам аголеных) дзяўчат ідуць звычайныя гараджанкі, якія зусім не кідаюцца табе на шыю ад аднаго толькі твайго «позірку мача» і не цягнуць самі ў... няважна куды. Таму, вядома, са смуткам. Жыццё іншае. І рэкламны ідэал адшукаць, напэўна, яшчэ нікому не ўдавалася.**

— Нейкі ты вельмі правільны. Ну добра!. Вы ж і самі ў жыцці не надта падобныя да тых фотаздымкаў, што тыражуюцца СМІ. Як сказала адна знаёмая, «непрыгожых людзей у інтэрнэце не засталося». Толькі навошта нам гэта? Цягнуцца людзі з усіх сіл, імкнуцца адпавядаць...Вось і атрымоўваюць... Аднойчы трапілася на вочы аб'ява пра тое, што для двух хлопчыкаў 2 і 4 гадоў шукаюць няньку: «Маладая жанчына з прыцягальнай знешнасцю». У дужках: «Хлопчыкі не любяць непрыгожых жанчын». Я вось і падумала: можа, там апіска? Можа, гэта для хлопчыка 24 гадоў нянька патрабавалася? Вынікі інфармацыйнай эпохі, так бы мовіць?

**— Так, такіх прыкладаў шмат. А вось калі сумленна: ты сама, хутчэй, закахалася б у прыгожага хлопца, як з вокладкі, ці ў непрыцягальнага, але, як кажуць, з пачуццём гумару?**

— Вось ведаеш, вы ж такія далікатныя, як парасткі якога-небудзь рададэндрана ў засушлівую пару. Калі мужчына разумее, што ён прыгожы, то паводзіць сябе звычайна яшчэ больш самаўпэўнена, чым дзяўчына-прыгажуня. Так што з прыгожымі трэба асцярожней — не асабліва імі ўражвацца. Толькі больш высноў рабіць не буду — тут гэта надта індывідуальна.

**— То бок, ты сцвярджаеш, што не трэба занадта звяртаць увагу на неадпаведнасць розным «стандартам»?**

— Пакуль ты думаеш пра стандарты, дзяўчаты думаюць пра іншых хлопцаў. Так што рабі выбар сам.

### ТЭСТЫ І ПРАДКАЗАННІ

**— Адна мая дзяўчына пры першай жа сустрэчы пачала пытацца, якога я знаку задыяка. Я думаў, проста так, а пасля яна выдала: «Мы з табою па гараскопе не падыходзім». І знікла...**

— ... А пасля прыйшла дадому, раскінула на цябе карты, пагледзела, што абяцае вашым адносінам асадак на дне кубка ад кавы і загаварыла над тваім фота сушаны хвосцік пацука-падлетка...

**— Вось табе смешна, а для мяне гэта была такая неспадзяванка! Увогуле, часта можна сустрэць у глянцы не толькі гараскопы, але і рознага кшталту «тэсты на сумяшчальнасць» і іншую псіхадэлічную хімію... Як быццам я карбід, які нельга змешваць з вадою.**

— А можа, проста яна — карбід, які нельга змешваць з карбідам... Добра, а калі сур'ёзна, то няма чаго крыўдзіцца. Правяраюць людзі, вылічваюць, выгадваюць. Мне больш падабаюцца псіхалагічныя тэсты тыпу «Наколькі ты прываблівая» ці «Чаму тваёй сяброўцы да гэтага часу не адрэзалі язык». Ну, ты разумееш... А калі пра варажбу розную казаць, то тут прыколаў шмат атрымоўваецца. Вось сумяшчальны Леў з Авенам. А чаму ён сумяшчальны — чорт яго ведае.

**— Напэўна, таму, што Леў з'есць Авена і не падавіцца. І на кампраміс пайсці не атрымаецца: няма каму будзе яго агучыць. Аднак я сам прытрымліваюся думкі, што самы лепшы шлях да разумення, ці падыходзіць хлопец дзяўчыне і наадварот, — рэальныя адносіны. Загадзя нічога ўсё роўна не зведаеш, калі ты, вядома, не Ванга.**

— Гэта ўсё так, але мяне больш здзіўляе тая сур'ёзнасць, з якой усе гэтыя тэсты-гараскопы падаюцца. Памятаеш, у дзяцінстве многія вялі такія сшытачкі-анкеты, дзе было такое дзіцячае гаданне — чыхалка? Чыхнеш у панядзелак — будзе табе шчасце, у аўторак — значныя фінансавыя выдаткі. І шмат яшчэ што. Вось тэсты і гараскопы вельмі нагадваюць гэта. Але ж адрозненне: іх чытаюць дарослыя цёткі. І пішуць таксама.

**— Апошнім за гэта плацяць грошы. А тыя, што чытаюць, проста, мабыць, хочуць быць упэўненымі хоць у чым-небудзь. Толькі, дарагія дзяўчаты, немагчыма гэта: ніколі не ведаеш, што адбудзецца ў наступную хвіліну, не тое, што як будуць развівацца адносіны з іншым чалавекам, які, між іншым, з'яўляецца цэлым раманам, што не варта было б чытаць, калі вядома, чым ён скончыцца.**

— Цікавасць да будучыні ўласціва і дзяўчатам, і хлопцам, толькі вы менш уражлівыя, таму не загаворваеце пацучыныя хвасты над фотаздымкамі. Ого, вось да чаго дагаварыліся! Відаць, час вынікі размовы падводзіць...

**— Можа, мы і менш уражлівыя, але нам таксама хочацца нармальных адносін без заган, навязаных рознымі там дзядзькамі ды цёткамі.**

— Атрымоўваеш звычайна тое, чаго жадаеш. А калі жадаеш слухацца парад з прыгожых глянцавых старонак — можна смела гэтым займацца, прапускаючы міма сапраўды каштоўныя моманты.

**Ганна ДАРЭЎСКАЯ,**
**Сяржук ПІСТАЛЕТАЎ.**

*Незвычайнае ў звычайным*

# ШТО Ў ПРОЗВІШЧЫ МАІМ?

**Адкуль узнікаюць мянушкі? Правільна, часцей за ўсё яны з'яўляюцца вытворнымі ад прозвішча, якое мае чалавек. Добра, калі гэта звыклыя на слых Іваноў, Пятроў ці Сідараў. А калі не? Як жывуць людзі, прозвішчы якіх часам успрымаюцца з усмешкай на вуснах?**

— У большасці выпадкаў людзі рэагуюць зусім неадэкватна, калі першы раз чуюць маё прозвішча, — расказвае **Ганна Барабан**, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ, — пачынаюць хіхікаць. Бывалі выпадкі, што ў некага нават пачыналася істэрыка ад смеху.

Раней я вельмі саромелася свайго прозвішча і гадоў да васямнаццаці жыла з думкай змяніць яго. Адной з самых распаўсюджаных мянушак у дзяцінстве была проста — Барабан. Пасля прыдумалі называць мяне Барабашкай.

Часам людзі не вераць, што ў мяне такое прозвішча, і атрымоўваюцца цікавыя дыялогі. Напрыклад:

— Прывітанне. Я — Аня Барабан.

— Прывітанне, а я — Рома Гітара (Кантрабас, Піяніна і г.д.) ці:

— Прывітанне, я Барабашка.

— А я Нафаня!

Многія журналісты кажуць мне: «Такое прозвішча выдатнае, нават псеўданім браць не трэба, яно заўсёды будзе на слыху».

З узростам я зразумела, што ў мяне прыгожае і гучнае прозвішча.

— Калі чуюць маё прозвішча першы раз, то часта прапаноўваюць руку і сэрца, — з усмешкай паведамляе **Дзмітрый Сямейка**. — А настаўнік у школе сказаў аднойчы, што з такім прозвішчам не грэх быць бабнікам.

Ва ўніверсітэце наконт майго прозвішча маюць іншае меркаванне. Так, выкладчык аднойчы сказаў: «Дзіма, ты цалкам адпавядаеш свайму прозвішчу, вядзеш сябе так, быццам ты не адзін, а цябе некалькі».

Я лічу, што ў мяне самае лепшае прозвішча!

Не менш цікавае жыццё і ў курсанта ваеннага факультэта БДУ **Васіля Боцмана**.

— Многія людзі, калі чуюць маё прозвішча, спачатку думаюць, што гэта мянушка. А калі ўсё-такі даведваюцца, што гэта не так, вельмі здзіўляюцца, у некаторых узнікаюць пытанні, напрыклад, ці служыў хтосьці з маіх родных на флоце і чаму я не пайшоў вучыцца ў мараходку.

Асноўная мая мянушка — гэта Боцман, аднак называлі яшчэ мічманам, юнгай. Акрамя таго, сябры ўвесь час расказваюць анекдоты пра боцмана. Я заўсёды з гумарам да гэтага стаўлюся!

Аднойчы здарыўся цікавы выпадак. Маё прозвішча сугучна з прозвішчам Гоцман, якое насіў афіцэр, што служыў у 31-м навігацыйна-тапаграфічным цэнтры Узброеных Сіл і займаў там пасаду галоўнага інжынера (амаль намеснік начальніка ). Калі я там праходзіў практыку, то ў мяне 4-5 разоў перапытвалі прозвішча, думаючы, што я родзіч таго самага Гоцмана. А аднойчы я ўвогуле сутыкнуўся з гэтым інжынерам, калі хтосьці клікаў мяне, а падышлі мы абодва! Гэта, напэўна, самае вясёлае было!

— Сябры звычайна называюць мяне па прозвішчы, — расказвае **Валерыя Кіслая**. — Людзі, якія гэта чуюць, здзіўлена пытаюць, чаму Кіслая. Калі чуюць, што гэта прозвішча, чамусьці збянтэжана глядзяць на мяне. Бывае і такое, што пытаюць: «А чаму не Салодкая?».

Часта людзі кажуць: «Галоўнае — не адпавядай свайму прозвішчу». Мама мне гэта кажа амаль кожны дзень!

Зразумела, што ў мяне былі і ёсць мянушкі. Я была Кісляцінай, Кіслінкай, Кіслатой, а ў пачатковай школе нават кіслай капустай называлі! Некаторыя настаўнікі ў школе называлі мяне не Кіслая, а Салодкая. Географ заўсёды Кісленькай называў. Пасля гэтага сябры пачалі называць мяне так. Сваё прозвішча я вельмі люблю і магу з упэўненасцю сказаць, што не памяняю яго ніколі, нават пад дулам пісталета!

Сваім меркаваннем наконт цікавых прозвішчаў падзялілася псіхолаг Ганна Парэчына:

— Я лічу, што ад самога чалавека залежыць, паўплывае яго прозвішча на жыццё ці не. Самыя немілагучныя прозвішчы, якія мне сустракаліся ў жыцці, ператвараліся ў мілагучныя дзякуючы дзеянням тых асоб, якія іх насілі, і гэтак жа здаралася зваротнае: асобы, што мелі вядомыя прозвішчы, мала што ўяўлялі сабой.

Ад перамены прозвішча вы не будзеце другім чалавекам. Падумайце над гэтым!

### А ВЫ ВЕДАЕЦЕ?

Некаторы час таму ў Францыі жыла сям'я, якая была пазбаўлена самага звычайнага прозвішча. Замест яго яна «насіла» набор лічбаў — 1792. А чатыры сыны ў гэтай сям'і насілі імёны месяцаў года.

Нешчаслівыя, здавалася б, прозвішчы — Магіла і Бяда, наадварот, лічацца шчаслівымі (па меркаванні гісторыкаў). Нашы продкі давалі сваім дзецям такія прозвішчы якраз на шчасце!

У Швецыі жыве больш за 300 000 чалавек з прозвішчам Карлсан, але, на жаль ці на шчасце, ніхто з гэтых людзей не жыве на даху.

У тэлефоннай кнізе Нью-Ёрка было 22 прозвішчы Гітлер да Другой сусветнай вайны і ніводнага — пасля.

Прозвішча, якое з'яўляецца самым рэдкім у свеце, мае адна ўсходняя сям'я. У ім няма ніводнай літары і абазначаецца яно шляхам аднаго апострафа (своеасаблівае прыдыханне перад пачаткам слова).

Як бачым, мець незвычайнае і цікавае прозвішча — гэта вельмі добра! Такія людзі заўсёды ў цэнтры ўвагі, яны карыстаюцца поспехам, і ўвогуле, іх жыццё напоўнена прыгодамі. Галоўнае, не саромецца свайго прозвішча і з гонарам яго насіць!

А вы задаволены сваім прозвішчам? Падзяліцеся думкамі з намі!

**Крысціна ШАЛАМІЦКАЯ.**

# МАЕ «ЎНІВЕРСІТЭТЫ»,
## або Нататкі на «палях» вучнёўскага сшытка

**Мы так шмат гаворым пра адукацыю (сярэднюю, вышэйшую, прафесійную і г.д.), так часта «мусолім» гэтае слова, што сэнс яго — не павярхоўны, утылітарны, а глыбінны і глыбокі — неяк заціраецца, адыходзіць на другі план.**

Калі і з чаго пачынаецца адукацыя? Можа, узяць за «кропку адліку» той момант, калі чалавек пачынае вучыцца чытаць? Але хіба тады, у свае 5-6 гадоў, складваючы з літар і складоў словы, ён разумее, што «працэс пайшоў»? Наўрад ці. Для мяне, напрыклад, гэта было, хутчэй, гульнёй, і, безумоўна ж, я не задумвалася пра тое, што закладваю «фундамент» для далейшага паспяховага навучання... А можа, маімі першымі крокамі ў свет адукацыі былі тыя «кружочкі» і «трохвугольнічкі», якія даводзілася старанна перамалёўваць з дошкі ўслед за выхавальніцай у дзіцячым садку? Зноў «міма». Я нават не разумела, навошта мы ўсе робім гэта, ды нам ніхто і не тлумачыў...

І толькі калі наша група ў дзіцячым садку стала самай старэйшай і падчас «ціхай гадзіны» пачаліся бурныя абмеркаванні таго, хто ў якую школу збіраецца ісці вучыцца, я зразумела, што там, за ўтульным дворыкам дзіцячага садка, ужо нельга паводзіць сябе, як дзіця, а трэба быць Дарослым (як мне тады падавалася), Самастойным і Адказным. Такія перспектывы палохалі. Але і прыцягвалі адначасова.

...І вось я ўжо сяджу насупраць сімпатычнай дзяўчыны («Бог мой, ды яна ж Настаўніца!») і адказваю на простыя (з пункту гледжання любога дзіцяці, у якога працуе «думалка») пытанні. «Як называюцца дзеці сабакі?» — «Шчаняты». — «А дзеці каровы?» — «Цяляты». Настаўніца добразычлівая і прыязная, але я ўсё роўна хвалююся: яшчэ ляпну штонебудзь не тое, і не бачыць мне тады школьнага жыцця! На шчасце, нічога такога не ляпнула, і мяне прынялі. Не, лепш так: МЯНЕ ПРЫНЯЛІ! Ды не куды-небудзь, а ў гімназію.

Пры ўзгадванні таго перыяду я думаю не пра ўрокі, да якіх даводзілася рыхтавацца, не пра веды, якімі папоўнілася мая «мазгавая скарбонка». Я думаю пра настаўнікаў і выкладчыкаў, якія паўплывалі на маё стаўленне да рэчаіснасці, на ўспрыняцце сябе і іншых.

Я не маю на ўвазе тых настаўнікаў (а іх хапае), якіх мала цікавіць вучань як Асоба. Для іх галоўнае, каб не парушалася зададзеная схема: «атрымаў веды — паказаў веды — атрымаў адзнаку». Ці набываеш ты ў працэсе навучання што-небудзь, акрамя ведаў, — такое пытанне ўвогуле не ставіцца. Хаця мяне заўсёды цікавіла менавіта гэта «акрамя». Таму і настаўнікаў успрымала перш за ўсё як «паплечнікаў» і, калі хочаце, саўдзельнікаў агульнага працэсу, якія дапамагаюць разабрацца, што да чаго (натуральна, маю на ўвазе не толькі вучэбныя праграмы).

У пачатковай школе мне сапраўды падабалася. Думаю, у гэтым вялікая заслуга нашай першай настаўніцы. Кожны з нас быў для яе любімым вучнем, для кожнага яна не шкадавала слоў падтрымкі і адабрэння. Успомніць хоць бы папяровыя «сардэчкі», якія яна наклейвала нам на сшыткі за пяць атрыманых запар «пяцёрак» (тады гэта быў вышэйшы бал). «Сардэчкі» і цяпер захоўваюцца ў мяне ў спецыяльнай скрынцы. Часам возьмеш у рукі — і пацяплее на душы... А ранішнікі па святах, у якіх Алена Генадзьеўна з радасцю ўдзельнічала, натхняючы і нас, першаклашак, на падрыхтоўку чагосьці цікавага і незвычайнага! А паштоўкі з віншаваннямі на Новы год, якія яна падпісвала для нас? Словам, гэта быў той рэдкі час, калі ў школу ХАЦЕЛАСЯ хадзіць. Вучоба здавалася захапляльнай гульнёй, а выкананне хатніх заданняў не выклікала нуду... Асабліва выразна мы ўсвядомілі тое, што ў нас самая цудоўная ў свеце настаўніца, калі яна пайшла ў дэкрэтны адпачынак, а замест яе з'явілася іншая, якая, калі дзеці чагосьці не разумелі ці рабілі не так, спакойна магла абазваць іх дурнямі ці яшчэ горш. Мы — маленькія чацвёртаклашкі, якія дзякуючы старанням Алены Генадзьеўны ўжо ведалі сабе цану — да такога не прывыклі. Дзякуй Богу, тая настаўніца ў нас не затрымалася...

А потым былі пяты клас, шосты, сёмы, восьмы... Шмат новых настаўнікаў, кожны са сваім прадметам і... характарам. Для мяне і многіх маіх аднакласнікаў было важным, што амаль усе яны валодалі добрым пачуццём гумару. Без гэтага педагог наўрад ці зможа настроіцца на адну хвалю з вучнямі, «адчуць» іх... Зразумела, імкненне ісці «ў нагу» з класам не павінна перарастаць у фамільярнасць, але злавіць і затрымаць увагу і інтарэс трыццаці чалавек педагогу без пачуцця гумару складана... Узгадваю і адну маладую настаўніцу, якая прыйшла ў нашу гімназію адразу пасля педагагічнага ўніверсітэта. Яна выкладала сусветную мастацкую культуру, дапамагала старшакласнікам ставіць нумары для школьных канцэртаў... А пасля гэтых канцэртаў, калі ўсе ўдзельнікі ішлі адзначаць удалае выступленне, чамусьці пагаджалася купляць віно па просьбе падлеткаў. Хоць гэта ўжо нават не фамільярнасць, а нешта за мяжой нармальных паводзін чалавека, які павінен быць прыкладам для сваіх вучняў.

**БЫЎ ЧАС, КАЛІ Ў ШКОЛУ ХАЦЕЛАСЯ ХАДЗІЦЬ...**

На шчасце, пашанцавала з настаўнікамі літаратуры — рускай і беларускай. Абмяркоўваць не нейкія адарваныя ад паўсядзённасці фізічныя формулы, уласцівасці альдэгідаў і месцазнаходжанні карысных выкапняў, а характары і ўчынкі людзей, такіх жа, як мы з вамі, ацэньваць іх думкі, матывы паводзін — што можа быць больш захапляльным? Пасля такіх размоў фізічна адчуваеш, як мяняешся, мяняецца твой светапогляд. Напэўна, тады я не проста «заклала фундамент» адукацыі, — я адбудавала практычна ўвесь «дом», засталіся толькі невялікія «аздабленчыя работы». Бясконца ўдзячна сваім настаўніцам літаратуры за тое, што гатовы былі выслухаць і пачуць кожнага, цанілі кожнае меркаванне («няправільных» думак не існавала!), за тое, што ад урока да ўрока раскручвалі механізм пад назвай «працэс мыслення».

Бліжэй да выпускнога 11-га класа на даляглядзе замаячыла паступленне. Хацелася і добры атэстат атрымаць, і на цэнтралізаваным тэсціраванні не падкачаць. Было цяжка, але я запэўнівала сябе: варта толькі паступіць, а там пачнецца зусім іншае, СТУДЭНЦКАЕ жыццё! І вучоба там цікавейшая, і свабоды больш, і людзі новыя...

Тэсціраванне засталося ззаду, я — студэнтка... Ужо пяты год як студэнтка... Свабоды тут сапраўды аказалася больш: ніякіх штодзённых хатніх заданняў, выкладчыкі ставяцца да цябе, як да дарослага чалавека, а «пары» часам можна прапусціць цалкам беспакарана. Адказнасці таксама больш, але ж калі адказнасць мяне палохала? І ўсё ж да пятага курса з'явілася нейкае... шчымлівае пачуццё расчаравання. «Горыч няспраўджаных спадзяванняў» — напісаў бы хто-небудзь з вялікіх. Навязлівае адчуванне, што вучылі не зусім так і не зусім таму... Ніякай віны выкладчыкаў тут няма. Я маю на ўвазе вучэбныя праграмы і арганізацыю працэсу навучання ўвогуле. Частку прадметаў, якія не маюць дачынення да спецыяльнасці, можна было б без шкадавання скараціць, частку — аб'яднаць у адзін курс... На пачатку вучобы ва ўніверсітэце я думала: вось адолеем агульнаадукацыйныя дысцыпліны, а на трэцім-чацвёртым курсе ўсе прадметы будуць непасрэдна датычыцца спецыяльнасці... Чацвёрты курс застаўся ззаду, але спецыяльнасць не стала бліжэй.

Разумею, што ўсе пройдзеныя прадметы пашыраюць кругагляд і прымушаюць звіліны працаваць, але калі б атрыманыя веды можна было прымяніць хаця б у змадэляванай сітуацыі будучай працы... Універсітэт «пасеяў» і мудрую думку: не трэба чакаць, пакуль цябе навучаць, лепш вучыцца самому. Спадзявацца трэба не на кагосьці ці штосьці, а ў першую чаргу на сябе. І не толькі ў адукацыі.

Што ж да ўніверсітэцкіх выкладчыкаў, на шчасце, мне ні пра каго не хочацца сказаць: «Вой, ды гэта проста жах! Яго на гарматны стрэл нельга падпускаць да студэнтаў!» (за ўсе пяць гадоў вучобы быў толькі адзін такі выпадак, але не будзем пра сумнае). Магчыма, у кагосьці з іх і выяўляліся «асаблівасці» характару, але ўзровень кваліфікацыі кампенсаваў гэтыя «хібы» з лішкам... Дарэчы, калі аднойчы хто-небудзь спытае мяне пра самага лепшага выкладчыка, я абавязкова назаву Сяргея Вікенцьевіча Сівуху. Гэта той, чыю «пару» ты ніколі не прапусціш — проста таму, што сорамна. Гэта асоба, чый велізарны інтэлектуальны багаж не «прыціснуў», а толькі адтачыў цудоўнае пачуццё гумару. Гэта чалавек, для вострых і дакладных заўваг якога адводзілася спецыяльная старонка ў канспекце, чыю канструктыўную крытыку ў свой адрас хацелася пачуць... Шкада, што Сяргей Вікенцьевіч перайшоў у іншы ўніверсітэт, і для тых студэнтаў нашага аддзялення, якім ужо не давядзецца папрысутнічаць на яго лекцыях, пачалася іншая эпоха — «без Сівухі». Як добра, што наш курс паспеў прайсці праз тую, першую эпоху.

На гэтым я пакуль стаўлю кропку, ці лепш сказаць — шматкроп'е. Бо нават калі не пайду ні ў магістратуру, ні па другую вышэйшую адукацыю, усё роўна буду вучыцца. Таму што паняцце адукацыі — гэта значна больш, чым атрыманне ведаў. Паставіць кропку ў гэтым працэсе — значыць перастаць развівацца. І хоць я не Сакрат і не Мантэнь, але нешта падказвае мне, што жывы чалавек не можа дазволіць сабе раскошу так «расслабляцца».

**Алена ЗАРЭЧНАЯ,**
**студэнтка 5-га курса Белдзяржуніверсітэта.**

# НА РЫНКУ СТУДЭНЦКІХ ПАСЛУГ...

**Праца для студэнтаў у сённяшняй сітуацыі — як глыток паветра. Моладзь хапаецца за розныя варыянты. Дзе ж і як сёння можа падзарабіць?**
**Усіх варыянтаў і не назавеш. Так што разгледзім самыя папулярныя.**

**АФІЦЫЯНТ**

Заўважыла, што шмат знаёмых выбірае менавіта такі спосаб заробку. Часцей за ўсё студэнту-афіцыянту прызначаюць пэўную колькасць гадзін на тыдзень. Што да зарплаты, тут таксама па-рознаму. У кагосьці яна фіксаваная, памесячная, а нехта атрымлівае яе адразу, пасля работы. Плюс чаявыя. Адзін студэнт-афіцыянт паскардзіўся мне, што чаявых яму амаль не дастаецца: навічкоў не дапускаюць адразу ж прымаць заказы. Студэнтка Анастасія Ляснічая расказала пра работу афіцыянта са свайго вопыту:

— Сумяшчаць працу і вучобу мне даволі проста, толькі вось трэба правільна размеркаваць час. Ведаеце, начальства ўваходзіць у маё становішча, калі я не магу прыйсці. Працую толькі па пятніцах, суботах і нядзелях. Зарплата падзённая.

Насця таксама сказала мне, што ў яе атрымліваецца зарабляць прыкладна 200 тысяч рублёў за дзень. Але ж яна аддае працы большую частку свайго часу.

Што ж, шукаем далей.

**КУР'ЕР**

Можна развозіць піцу, бытавыя тавары ці нават раскладаць па паштовых скрынях рэкламкі. Але, каб праца была плённай, трэба ведаць мясцовасць. Напрыклад, у сталіцы не кожны правінцыял хутка зарыентуецца. А аплата, між тым, лічыцца па «завершаных місіях» — дастаўках. Змарнуеш час, заблудзішся — нічога не заробіш. Здаецца, работа кур'ерам і цікавая, і актыўная. Аліна Мацюк падпрацоўвала такім чынам. Расказала і пра падводныя камяні:

— За 1000 раскіданых па скрынях аб'яў плацілі 15 тысяч рублёў. Спачатку ўсё было нармальна, праблем не было. Разносіла недзе каля 2 тысяч лістовак за 3 гадзіны. Але часта ўзнікалі непаразуменні з людзьмі. Хто накрычыць, хто пад'езд не адчыніць. Калі ўсё гэта пачало назапашвацца, я атрымала законныя грошы і сышла, каб не псаваць сабе нервовую сістэму. Больш на такую працу не згаджуся.

Але калі вы палічылі, што з камунікацыяй у вас усё ў норме, пазначце як варыянт. Калі ж не падабаецца кур'ерская служба, рухаемся далей.

**РЭРАЙТАР**

Хто яшчэ не ведае, рэрайтар перапісвае ўжо гатовыя тэксты іншымі словамі, фактычна робіць новы матэрыял. Патрэба ў такім «спецыялісце» ўзнікае на розных сайтах. Аплата адбываецца па факце выканання работы і звычайна вылічваецца «сімвалічна». Напрыклад, 5 тысяч рублёў за тысячу знакаў без прабелаў. Але расцэнкі бываюць розныя. А яшчэ ў сайтаў бывае патрэба ў адміністратарах. Хтосьці падумае: «Халяўныя грошы». Але гэта не так. Некаторым людзям увогуле лягчэй працаваць фізічна, чым напружваць мазгі. Калі вы з гэтай катэгорыі, міласці просім у...

**СУПЕРМАРКЕТ**

Тут можна будзе заглядацца на паліцы, але не каб купіць нешта, а дагледзець, ці ўсё на сваім месцы ляжыць. Такая праца сапраўды цяжкая. І часу шмат займае. Але і плацяць студэнтам тут няблага. Недзе каля мільёна рублёў.

Часта асабліва старанныя студэнты кажуць, што працаваць трэба толькі летам. У гэтую пару ёсць свае заняткі. Дарэчы, звярнуўшыся ў БРСМ, вы абавязкова атрымаеце хоць якое-небудзь заданне. А яшчэ можна напрасіцца ў лагер і выхоўваць там дзяцей.

**ШТО, ДЗЕ І ЯК?**

Банальна, але... Хто шукае, той заўсёды знойдзе. Самы просты варыянт — прыглядацца да аб'яў у тым жа метро ці купіць газету. Яшчэ адзін, як ужо пісалася, — звярнуцца ў БРСМ. Пашукайце працу і ў інтэрнэце. Ёсць некалькі спецыялізаваных сайтаў для такіх мэтаў. Калі яшчэ не ведаеце, я вам падкажу. Вось тут jobs.tut.by, тут-praca.by і тут-rabota.by. Лепш за ўсё пакінуць сваё рэзюмэ. І тады, як сказала адна з маіх суразмоўніц-студэнтак, праца, магчыма, сама знойдзе вас. Але лепш не чакайце цуда, а намагайцеся знайсці працу самі.

А ці сапраўды патрэбна працаваць студэнту? У матэрыяльным плане — безумоўна. Але ж яшчэ трэба вучыцца. І абавязкова адпачываць. Хацелася б толькі, каб людзі не ўспрымалі студэнтаў як гультаёў, якія жывуць, толькі бавячы час. Большая частка з іх ці працуе, ці ўжо шукае працу, каб не сядзець на бацькоўскім карку. Дык ці не пажадаем мы з вамі ім поспехаў?

**Марыя БАЗУЛЬКА,**
**студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**



Муз-news

# Андрэй Разін: «З «ЛАСКАВЫМ МАЕМ» ХАЦЕЛІ ПЕРАСПАЦЬ УСЕ...»

**Сёмага сакавіка на сцэне к/з «Мінск» вядомы гурт «Ласкавы май» упершыню пасля чатырох гадоў адсутнасці ў калектыве саліста Андрэя Гурава, уз'яднаецца ў былым складзе.**

Мінскі канцэрт стане першым выступленнем уз'яднанага складу гурта пасля чатырохгадовай паўзы, якая ўзнікла ў сувязі з адбываннем турэмнага пакарання аднаго з удзельнікаў калектыву Андрэя Гурава. У беларускім турнэ ў складзе «Ласкавага мая» будзе адсутнічаць толькі Юра Шатуноў, які зараз працуе над сваім сольным альбомам і да лета будзе знаходзіцца ў Германіі, дзе ён, прынамсі, і жыве апошнія некалькі гадоў.

— Але, акрамя Юры Шатунова, усе астатнія ўдзельнікі старога складу гурта прыедуць, — расказвае



Андрэй Разін. — Гэта Сяргей Сяркоў, Дзмітрый Весялоўскі, Андрэй Гураў і я, Андрэй Разін.

Напярэдадні канцэртаў гурта ў Беларусі (акрамя сталіцы, артысты плануюць выступленні ў Гродне, Лідзе і інш.) прадзюсар гурта Андрэй Разін распавёў «Звяздзе» пра сваё стаўленне да нашай краіны, а таксама да калег па творчым цэху.

**«Беларусь была і застанецца самай пявучай краінай на ўсёй постсавецкай прасторы»**

Каментуючы выказванні свайго «калегі» па творчым цэху Канстанціна Меладзэ, які ў адным з інтэрв'ю назваў Разіна «разбуральнікам і разбэшчвальнікам краіны», Разін назваў Меладзэ «казлом», а яго музыку — пазбаўленай таленту.

— Яго дзяўчатак з «ВІА ГРА» я ведаю, вельмі харошыя дзяўчаткі, а вось пра іх прадзюсара так выказацца не магу. Ды і назва калектыву гаворыць толькі пра тое, што праект разлічаны на тых, хто пакутуе на імпатэнцыю.

Што датычыць беларускай копіі расійска-ўкраінскага гурта «ВІА ГРА» — гурта «Топлес», — то пра гэты праект, прызнаўся Разін, ён нічога не чуў. Нягледзячы на гэта, знакамітаму прадзюсару падабаецца сучасная беларуская эстрада. Нашу краіну ён называе адной з найлепшых еўрапейскіх краін і дадае, што Беларусь «была і застанецца самай пявучай краінай на ўсёй постсавецкай прасторы».

— Я добра ведаю Ларысу Грыбалёву, Сашу Саладуху, шмат канцэртаў правялі мы, запрашаючы і Ліку Ялінскую..., — узгадвае Андрэй Разін. — Увогуле, у Беларусі заўсёды былі самыя прыгожыя галасы і самыя прыгожыя людзі. Памятаю, калі я быў дырэктарам Стаўрапольскай краявой філармоніі, мы ладзілі фестываль беларускай песні, запрашаючы на яго беларускіх выканаўцаў. Што вы думаеце — быў аншлаг! Ніводнага лішняга білета. Нават на «Боні М» стаўрапольцы так не ішлі, як на беларускіх артыстаў.

Распавядаючы пра сённяшні стан «зачараванасці» расіянамі беларускай музыкай, Разін зазначае, што «з 10 выпадковых званкоў на мабільныя ў трох-чатырох выпадках вы пачуеце беларускую музыку».

— Калі мы прыязджалі ў Беларусь з канцэртамі, у нас была такая традыцыя — далучаць да нашых выступленняў маладых беларускіх артыстаў з іх песнямі. Не выключаю, што да такой формы мы звернемся і сёлета.

На пытанне пра прыхільніц, Разін з усмешкай адказвае:

— З «Ласкавым маем» калісьці хацелі пераспаць усе, нават Раіса Максімаўна. Але як і дваццаць гадоў таму, так і сёння я трымаю сваіх хлопцаў пад пільным наглядам, каб ніводная з дзяўчат не прасачылася да іх у грымёрку. Менавіта з гэтай мэтай я заўсёды наймаў і наймаю 15 целаахоўнікаў для нашага калектыву. Целаахоўнікі са сваёй задачай спраўляліся заўжды выдатна, — гастрольных раманаў не было. А сёння ўсе хлопцы ў «Ласкавым маі» сямейныя — маюць і жонак, і дзяцей.

**Ілья ЛАПАТО.**

Далікатная тэма

## УСЕ ПАДЛЕТКІ РОБЯЦЬ ГЭТА?

**Вынікі праведзенага ў Віцебску сацыялагічнага даследавання па тэме сэксуальных паводзін і адукацыі падлеткаў і моладзі здзівілі нават спецыялістаў. У прыватнасці, больш за палову з апытаных (53 працэнты) шчыра прызналіся, што пачалі палавое жыццё ва ўзросце да 14-16 гадоў. Пасля першага сэксуальнага кантакту мелі больш за трох сэксуальных партнёраў — і гэта звыш 50 працэнтаў рэспандэнтаў.**

Апытанне праводзілася ў некалькіх, бадай, самых папулярных сярод моладзі Віцебска культурна-забаўляльных цэнтрах. Як расказаў **галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансэра Віктар СПІРЫДОНАЎ**, у рэйдзе бралі ўдзел не толькі супрацоўнікі дыспансэра, але і прадстаўнікі аддзела прафілактыкі СНІД Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, а таксама ўпраўлення ўнутраных спраў і ўпраўлення культуры аблвыканкама. А яшчэ ў двух клубах медыкі разам з валанцёрамі грамадскай арганізацыі «Ульяна» правялі імправізаваны «прыём». Усе ахвотныя маглі падысці да століка спецыялістаў, каб задаць пытанні, якія іх цікавяць. Некаторыя не ўтойвалі падчас размоў з медыкамі, што займаліся сэксам непасрэдна ў клубах. Некаторыя адзначылі, што прэзерватывы, якія прадаюцца ў клубах, параўнальна дарагія.

Маюць пастаяннага палавога партнёра 73 працэнты апытаных. Заўсёды выкарыстоўвае засцерагальныя сродкі прыкладна пятая частка.

Спецыялісты перакананыя, што тэму палавога выхавання «замоўчваць» не трэба. Яшчэ лепш — мець нацыянальную стратэгію па прафілактыцы інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, арыентаваную менавіта на моладзь. Неабходна і распрацоўка адзінага падыходу да пытанняў палавога выхавання ўсіх «зацікаўленых» спецыялістаў — медыкаў, настаўнікаў і іншых.

Дык калі ж пачынаць сэксуальнае жыццё? Не раней за 21 год — перакананы некаторыя псіхолагі, калі чалавек псіхалагічна, а не толькі фізічна «гатовы» і можа рэальна ацэньваць стан спраў: выбіраць партнёра не толькі «на эмоцыях», але і «галавой».

У любым выпадку, у першую чаргу ад бацькоў залежыць, наколькі правільна будуць выхаваны дзеці ў пытаннях сэксуальнай культуры. «Красамоўная» лічба — толькі 6 працэнтаў дзяўчат і хлопцаў канстатавалі падчас апытання, што інфармацыю пра тыя ж сродкі кантрацэпцыі атрымалі ад бацькоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПОЗНІЯ СЛЁЗЫ

**У Брэсце асуджана дзяўчына, якая ледзь не ўзарвала пяціпавярховы дом.**

Надзвычайнае здарэнне ў адным з дамоў абласнога цэнтра мела месца яшчэ ў маі мінулага года. Як расказала нам старшы памочнік пракурора вобласці Вольга ДЗМІТРУК, 19-гадовая дзяўчына вырашыла ўзарваць кватэру, у якой яны з маці пражывалі. Яна адкрыла чатыры канфоркі і духоўку газавай пліты, вокны шчыльна зачыніла, перакрыла выцяжку на кухні, запаліла дзве лампадкі і пайшла з дому.

Шчасце ўсяго дома, што гаспадыня кватэры вярнулася бліжэй да абеду. Адчуўшы рэзкі пах газу, жанчына выклікала аварыйную службу. Спецыялісты адразу перакрылі доступ газу ў кватэру, затым адчынілі ўваходныя дзверы.

Сама віноўніца надзвычайнага здарэння казала ў судзе, што яна не хацела ўзрываць суседзяў, а мела намер разбурыць толькі сваю кватэру. Аднак суд палічыў, што яна разумела, да якіх наступстваў можа прывесці яе дзікі ўчынак. Ва ўсялякім разе, сваю любімую котку з кацянятамі яна загадзя вынесла ў хлеў.

Сваю віну дзяўчына так і не прызнавала. А вось калі пачула, што можа пазбавіцца волі, то ўчыніла неверагодную істэрыку. Толькі запозненае «мора слёз» не ўразіла суд. І няўдалая «готка» была ўзята пад варту непасрэдна ў зале. За краты яна накіроўваецца на тры гады. Можа, у калоніі да яе прыйдзе ўсведамленне таго, якім кашмарам яна зрабіла жыццё сваёй маці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


БПС-СБЕРБАНК

**ОАО «БПС-СБЕРБАНК» ИНФОРМИРУЕТ:**

***В связи со снижением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 43% до 38% годовых,***
**ОАО «БПС-Сбербанк» с 01.03.2012 устанавливает по банковским депозитам физических лиц в белорусских рублях следующий размер процентов:**

| Наименование депозита/ сумма вклада | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | |
|---|---|---|---|
| | 90–189 дней | 190–369 дней | 370–500 дней |
| **«Сохраняй»** | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 43,5 (СР+5,5 п.п.) | 45,25 (СР+7,25 п.п.) | 46,5 (СР+8,5 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 45 (СР+7 п.п.) | 46,25 (СР+8,25 п.п.) | 46,75 (СР+8,75 п.п.) |
| от 25 млн. – до 100 млн. | 46 (СР+8 п.п.) | 46,5 (СР+8,5 п.п.) | 47 (СР+9 п.п.) |
| от 100 млн. | 46,25 (СР+8,25 п.п.) | 46,75 (СР+8,75 п.п.) | 47,5 (СР+9,5 п.п.) |
| **«Пополняй»** | | | |
| от 500 тыс. – до 5 млн. | 43,25 (СР+5,25 п.п.) | 45 (СР+7 п.п.) | 46,25 (СР+8,25 п.п.) |
| от 5 млн. – до 25 млн. | 44,75 (СР+6,75 п.п.) | 46 (СР+8 п.п.) | 46,5 (СР+8,5 п.п.) |
| от 25 млн. – до 50 млн. | 45,75 (СР+7,75 п.п.) | 46,25 (СР+8,25 п.п.) | 46,75 (СР+8,75 п.п.) |
| от 50 млн. – до 100 млн. | 46 (СР+8 п.п.) | 46,5 (СР+8,5 п.п.) | 47 (СР+9 п.п.) |
| от 100 млн. | 46,2 (СР+8,2 п.п.) | 46,7 (СР+8,7 п.п.) | 47,4 (СР+9,4 п.п.) |
| **«Управляй»** | | | |
| 1,5 млн. | 40 (СР+2 п.п.) | 40,5 (СР+2,5 п.п.) | 41 (СР+3 п.п.) |
| 5 млн. | 41 (СР+3 п.п.) | 41,5 (СР+3,5 п.п.) | 42 (СР+4 п.п.) |
| 25 млн. | 44 (СР+6 п.п.) | 45 (СР+7 п.п.) | 46 (СР+8 п.п.) |
| 100 млн. | 44,5 (СР+6,5 п.п.) | 46 (СР+8 п.п.) | 47 (СР+9 п.п.) |
| **Депозит и карт-счет «Пенсионный» – 38 (СР)** | | | |

**По депозитам, привлеченным до 01.03.2012, а также по ранее отмененным, установленный размер процентов будет применен с 01.04.2012.**

| Наименование депозита | Срок привлечения | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | за 1-й – 4-й месяцы | за 5-й – 10-й месяцы | за 11-й – 12-й месяцы |
| **«Баланс интересов»** | 1 год | 44 (СР + 6) | 45 (СР + 7) | 46 (СР + 8) |
| **«Перспективный»** | 18 месяцев | 46 (СР + 8) | | |
| **«К совершенно-летию»** | 2 года | 41 (СР + 3) | | |
| | 3 года | 42 (СР + 4) | | |

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк»,
на сайте банка **www.bps-sberbank.by** или по телефонам:
- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148, 2-148-148;**
Velcom **(044) 77-00-148, 77-55-148.**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2011 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,0; март – 6,6; апрель – 6,2; май – 7,2; июнь – 7,5; июль – 8,7; август – 10,9; сентябрь – 13,1; октябрь – 16,7; ноябрь – 19,5; декабрь – 24,1.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».*



## ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | 1. Стеллаж металлический пристенный 2,2*1,2 в количестве 4-х единиц по цене 541 000 белорусских рублей за единицу.<br>2. Мясорубка FAMAFTS 106 E, одна единица стоимостью 3 545 000 белорусских рублей.<br>3. Стол для сбора остатков пищи 1,05*0,6*0,85 одна единица стоимостью 1 032 000 белорусских рублей.<br>4. Стол производственный 1200*600*860 в количестве 3-х единиц по цене 2 042 000 белорусских рублей за единицу.<br>5. Стол производственный 1500*600*860 в количестве 2-х единиц по цене 2 269 000 белорусских рублей за единицу.<br>6. Стол производственный 950*600*860 в количестве 3-х единиц по цене 1 761 000 белорусских рублей за единицу.<br>7. Тележка сервировочная 0,8*0,5*0,8, одна единица стоимостью 1 833 000 белорусских рублей.<br>8. Электроплита ПЭСМ-4Ш одна единица стоимостью 4 830 000 белорусских рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ООО «Эланта», УНП 391452172** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Полоцк, ул. Богдановича, 10 (кафе «Графити»)** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **С 9.00 22 марта 2012 года по 18.00 31 марта 2012 года**<br>На интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь<br>**http://court.by/sales/** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | **Хозяйственный суд Витебской области**<br>**210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http://court.by/vitebsk/**<br>Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс. (80212) 49 13 49, (8 029) 663 53 24, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днём размещения публичного извещения об электронных торгах на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию.<br>Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670 **не позднее 16.03.2012** и заполняет заявление.<br>**Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/sales/.** |

**Доктар МУЗло**

# ТАКІХ БЯРУЦЬ У КАСМАНАЎТЫ

**Гурт «БЕЗ БІЛЕТА» выпусціў і змясціў у інтэрнэце максі-сінгл «Адрас — планета Зямля». Здавалася б, пасля такой назвы з дыягназам калектыву ўсё зразумела. Але насамрэч усё вельмі нават аптымістычна.**



Галоўным упрыгажэннем сінглу стала кампазіцыя «Фатон-1», дзе выкарыстаны запіс перамоў беларускага касманаўта Уладзіміра Кавалёнка з Цэнтрам кіравання палётамі. У 1978 годзе падчас знаходжання на арбітальнай станцыі «Салют-6» касманаўт назіраў неапазнаны лётаючы аб'ект. Невядома дакладна, ці далі веры «Фатону-1» (такі быў асабісты пазыўны Кавалёнка) у Цэнтры, а вось музыканты ўспрынялі гісторыю земляка адназначна, як кантакт з незямной цывілізацыяй. «Фатаграфія Уладзіміра Кавалёнка з аўтографам некалі стаяла на стале ў маіх бабулі і дзядулі — ён падарыў здымак, калі прыязджаў у Вілейку на сустрэчу з жыхарамі горада, — узгадвае лідар гурта «БЕЗ БІЛЕТА» Віталь Артыст. — Я вельмі люблю разглядваць гэтае фота. І цяпер наша кампазіцыя стала прыемным творчым уз'яднаннем з успамінамі дзяцінства».

Свой адказ космасу, дзякаваць здароваму сэнсу, хлопцы на арбіту не запусцілі, а выканалі жыўцом — у Маскве і Санкт-Пецярбургу, а на чарзе Гомель, Віцебск, Магілёў і Мінск (7 і 8 сакавіка).

# ДЗМІТРЫЙ КАЛДУН УЯВІЎ СЯБЕ ПІЛОТАМ



**Любімы горад можа спаць спакойна: здзяйсняць рызыкоўныя палёты над начным Мінскам артыст не плануе. Затое праедзе па Беларусі з гастрольным турам, каб не без гонару прадставіць прыхільнікам свой новы альбом «Начны пілот».**

Гэты год ужо шмат у чым стаў знакавым для Дзмітрыя Калдуна: у студзені ён ажаніўся (выбранніца Дзмітрыя — яго школьнае каханне); у лютым на тэлеэкраны выйшаў серыял «20 гадоў без кахання», у якім спявак не толькі зняўся, але і саўндтрэк да яго напісаў; а ў сакавіку ўбачыць свет другі альбом з 12 песнямі. «У параўнанні з дэбютным дыскам гэты атрымаўся больш лірычным і больш сучасным па гучанні, — канстатуе спявак. — У ім ёсць тое, чаго мне хацелася дасягнуць, — адчуванне гукавога і сэнсавага аб'ёму, атмасфера палёту. Натуральна, адбіліся на музыцы і падзеі ў асабістым жыцці. Не тое каб літаральна, але на ўзроўні агульнага ўнутранага шчасця — дакладна».

У Мінску прэзентацыя «Начнога пілота» адбудзецца 17 сакавіка. Далей у маршруце тура — Гродна, Магілёў і Гомель. І толькі напрыканцы сакавіка, прашу заўважыць, новую праграму ды найлепшыя папярэднія хіты Калдун прадставіць у Расіі. А то нагаворваюць тут некаторыя: маўляў, не патрыёт, не патрыёт...

# ДЫХАЦЬ ПА-ФРАНЦУЗСКУ

**Я таксама не ведаю, як гэта — ротам праз нос, ці нейкім іншым мудрагелістым спосабам. Затое гурт «Atlantica» ведае. Больш за тое — прадэманструе ўсім ахвотным 13 сакавіка ў КЗ «Мінск». У праграме «Подых Францыі» абяцаюць прадставіць любімыя кампазіцыі з мінулых альбомаў плюс прэм'еры песень з новага альбома «V», які неўзабаве павінен выйсці ў Беларусі і Францыі.**



За мінулы год калектыў не раз наведваў радзіму Д'Артаньяна і Квазімоды з прамапаездкамі ды выступленнямі. З уражанняў гэтых вандровак і склаўся новы кірунак работы (цяпер «Atlantica» ўсё часцей спявае не толькі на англійскай, але і на французскай мове), а таксама вялікая канцэртная праграма. «Выступленне будзе з жывым складам музыкантаў, — абяцае дуэт, — бо ў альбомах у нас музыка больш халодная, а ў канцэртнай версіі з'яўляецца больш эмоцый і энергетыкі. Дарэчы, некаторыя песні прагучаць у абноўленых версіях: напрыклад, «Do You Do You Wanna» робім у лацінаамерыканскай стылістыцы».

Дарэчы, відаць, падхапіўшы ў Францыі вірус рамантызму, музыкі захварэлі на рамантыку ў вострай форме і напярэдадні 8 Сакавіка вырашылі зрабіць прыхільніцам падарунак. Дакладней, 100 падарункаў — менавіта столькі аўтарскіх віншавальных «Atlantica» падпіша дзяўчатам і жанчынам, якія дашлюць свой паштовы адрас да 5 сакавіка на скрыню atlantica.8marta@gmail.com. А што, не ўсё ж спяваць пра пачуцці — можна і пісьмова іх засведчыць.

На гэтым пакуль што ўсё. Закаляйце, паважаныя меламаны, свае вушы беларускай эстрадай і не забывайцеся своечасова рабіць прышчэпкі добрага густу ад эпідэміі пошласці. І памятайце: здаровых у шоу-бізнэсе няма, ёсць неабследаваныя.

**З павагай, Доктар МУЗло.**

# У МІНСКУ ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ «ULTRA-MUSIC AWARDS»:

## у цэнтры скандалу — «Не прислоняться the band»

**Яшчэ не паспела прайсці шуміха з «Еўрафэстам», як у абшарах інтэрнэту маленькім сінім (пакуль) полымем разгараецца новая незадаволенасць чарговым музычным галасаваннем. Можа, гэта і не такая ўжо прыкметная для мільёнаў беларусаў прэмія. Да нядаўняга часу вядомы толькі ў вузкіх колах меламанаў і журналістаў інтэрнэт-партал «Ultra-Music» набыў новую «славу». Вось ужо ў трэці раз сайт уручае прэмію ў вобласці музычных дасягненняў «Ultra-Music Awards» — своеасаблівы адказ прэміям «MTV», «МУЗ-ТВ» і «EMA». Зоркі гэтага шоу па чырвоных дарожках не ходзяць, вячэрнія ўборы не апранаюць, ды і па ТБ не транслююць гэтую музычную падзею. Тым не менш ёсць сэнс ганарыцца статуэткай «UMA».**

Але сёлета «UMA», як бомба запаволенага дзеяння, цікала-цікала і ў выніку падарвалася не абы-якім «скандалам». Як толькі былі апублікаваны вынікі галасавання, на сайт пасыпаліся «гнеўныя» каментары пра тое, што галасы накручаны. Больш за ўсё смецця паляцела ў бок маладога, нібы малавядомага, гурта «Не прислоняться the band», які, па меркаванні карыстальнікаў інтэрнэту, заняў 1-е месца ў намінацыі «Лепшая беларуская песня 2011 года», абагнаўшы дзве кампазіцыі Ляпіса Трубяцкога! Больш паблажліва паставіліся да перамогі «Litesound» у намінацыі «Лепшы беларускі кліп года». Хоць гурт таксама апярэдзіў Ляпіса.

Не абышоў бокам вынікі галасавання і музычны партал «Тузін.FM.», які апублікаваў матэрыял «Вынікі Ultra-Music Awards: перамагае той, хто спаміць». Журналіст акуратна, але трапна і не зусім пахвальна выказваецца накошт «Не прислоняться the band», якія, магчыма, ужо і не рады сваёй перамозе. На пытанне пра тое, чаму на сайце выказаны толькі адзін пункт гледжання — рэдакцыі сайта «Ультра М'юзік», які ў гэтым выпадку прадставіў Вячаслаў Радыёнаў, і чаму ў матэрыяле зроблены акцэнт толькі на гурт «Не прислоняться the band», адказаў Сяргей Будкін, галоўны рэдактар інтэрнэт-партала «Тузін.FM»:

— Матэрыял, які вы маеце на ўвазе, меў на мэце праінфармаваць пра ўзнагароды сайта «Ультра М'юзік». Вынікі галасавання па згаданым сайце нам падаліся, у некаторай ступені, нечаканымі, як у выпадку з намінацыяй «Лепшая беларуская песня». У сувязі з гэтым мы адрасавалі пытанне кіраўніку сайта, ці лічыць ён, што інтэрнэт-апытанне можа адлюстроўваць рэальны стан рэчаў. Яго адказ у тэксце. Пажаданне непасрэдна гурту — дасягнуць сапраўдных рэальных поспехаў.

Узнікае толькі адно пытанне: а як жа меркаванне іншага боку? Чаму былі апытаны толькі Вячаслаў Радыёнаў? Можа, мае сэнс даць слова музыкам — напрыклад, тым жа самым «Не прислоняться the band»? Ды і наогул, з чаго раптам паспрабавалі «задзяўбці» толькі іх? Давайце закоцім істэрыку вакол Adele ў намінацыі «Лепшая замежная песня»: маўляў, а як жа Брытні Спірс, якая адрадзілася, што тая птушка фенікс? Ды толькі тут усе ў адзін голас скажуць: колькі людзей — столькі і меркаванняў. Гэта, мабыць, самая разумная думка з усіх выказаных. Такое меркаванне, вядома, прадрукавалася ў каментарыях на «Ультра М'юзік», толькі вось на гэтым сваю ўвагу старажылы беларускай музычнай інтэрнэт-журналістыкі — сайт «Тузін.FM.» — не спынілі. Неадназначна падкрэсліваў у каментарыях праўдзівасць галасавання і сам каардынатар праекта «Ультра М'юзік» Вячаслаў Радыёнаў.



***— Вячаслаў, у каментарыях да вынікаў галасавання на вашым сайце вы кажаце: «Вынікі галасавання адлюстроўваюць густы аўдыторыі. Мае асабістыя меркаванні пры гэтым могуць адрозніваецца». Калі гэта так, тады чаму вы даяце такія каментары для «Тузін.FM.»? І чаму гаворыце пра несправядлівасць першага месца ў намінацыі «Лепшая беларуская песня 2011 года?» Вы ж казалі, што накручаныя галасы здымаліся.***



— Ні слова пра несправядлівасць першага месца я не казаў. Проста пытанне ад «Тузіна» гучала менавіта пра песню «Осторожно» «Не прислоняться the band». Я толькі сказаў, што яна, як і большасць пераможцаў інтэрнэт-галасаванняў, перамагла за кошт планамернай рэкламы, у тым ліку і спаму па сябрах-знаёмых у сацыяльных сетках. Думаю, з гэтым ніхто спрачацца не будзе. Гэта звычайная, хоць і заганная практыка. Але мы здымалі толькі штучныя галасы, якія атрымалі з дапамогай робатаў, ці галасы, якія збіраліся атрымаць за кошт падключэнняў праз розныя проксі-серверы.

***— Ці не лічыце вы, што, калі ў наступным годзе скароціце колькасць намінацый для інтэрнэт-галасавання, то сама прэмія будзе адлюстраваннем меркавання выключна рэдакцыі сайта?***

— Мы пакуль сур'ёзна не думалі пра канцэпцыю наступнай прэміі. Яшчэ ўручэнне цяперашняй не адбылося. Варыянты са скарачэннем намінацый для галасавання былі і раней, але пакуль не прадпрымаліся нейкія радыкальныя крокі па змене фармату. Праўда, магчыма, што ў наступным годзе галасаванне будзе арганізавана толькі для зарэгістраваных на сайце людзей ці для тых, якія ўвайшлі на сайт праз акаўнты ў сацыяльных сетках. Гэтай методыкай мы скарысталіся на першым этапе галасавання. Сёлета яна таксама паспяхова выкарыстоўваецца іншымі інтэрнэт-прэміямі, у тым ліку цяпер і ў «Чартовой дюжине» расійскага «Нашего радио».

***— Ці ёсць наогул сэнс праводзіць адкрытыя галасаванні, калі заўсёды застаецца шмат незадаволеных? З іншага боку, калі выбар будзе толькі за рэдакцыяй, як маладыя гурты змогуць заявіць пра сябе?***

— Маладых і перспектыўных мы заўсёды адзначаем рэдакцыйнымі ўзнагародамі. У 2009 годзе за лепшы дэбют і адкрыццё года іх атрымалі «Akute» і «The Blackmail», якія ўжо летась цалкам доказалі і апраўдалі наш выбар, выпусціўшы ўдалыя альбомы і збіраючы вялікія пляцоўкі. У 2010 годзе ў такіх жа намінацыях выйгралі «Clover Club» і «Sang Sattawood», якія сталі за мінулы год даволі папулярнымі. Так што менавіта прасоўванне ў медыйную прастору новых імёнаў — адна з галоўных для нас задач. Мне здаецца, праз галасаванне выбіцца новым гуртам больш складана. І хоць кожны год мы сутыкаемся з вялікай незадаволенасцю і крыўдамі, пакуль пераможцаў у асноўных намінацыях UMA выбіраюць менавіта наведнікі сайта.

Зараз ужо мала ў каго павернецца язык назваць «Не прислоняться the band» малавядомым гуртом, бо шуміха, якая разгарнулася вакол яго імя, дадала музыкам бясплатны піяр і толькі павялічыла цікавасць да іх сціплых персон. Лідары «Не прислоняться the band» Максім Юхновіч і Арцём Данцоў не маглі не скарыстацца магчымасцю выказацца накошт «UMA»:

***— Хлопцы, як вы ставіцеся да таго, што рэдактар партала «Ультра М'юзік» дае такія каментары «Тузіну»?***

**М.Ю:** У рэдактара сайта былі, відавочна, вызначаныя фаварыты ў гэтым галасаванні, і, зразумелая справа, мы ў іх лік не ўваходзілі. У прынцыпе, хто яны — стала ясна пасля таго, як былі абвешчаны ўдзельнікі самога канцэрта. Нічога не маю супраць усіх калектываў, але хіба беларуская рок-сцэна складаецца з фолку, зашмальцаванага англамоўнага рок-н-рола і няякаснага псіхадэла? Усё, што выходзіць за рамкі гэтых стыляў, у нашай краіне ўжо лічаць «малавядомай» папсой.

**А.Д.:** А як наогул ставіцца да гэтага партала, калі, па-сутнасці ён з сябе нічога не ўяўляе. Яны паліваюць нас брудам, выстаўляючы напаказ стандартных беларускіх псеўдазорак. Бяда толькі ў тым, што тая музыка, якую могуць падаць нам нібы фіналісты галасавання, даўно састарэлая і не каціруецца нават на рынку СНД, не кажучы ўжо пра сусветныя маштабы. Мне нават цяжка сказаць, хто наогул такое слухае.

***— Што ўвогуле думаеце наконт такіх галасаванняў?***

**А.Д.:** Асабіста я лічу, што такія галасаванні з'яўляюцца бессэнсоўнымі. Дурное — параўноўваць гурты розных узроўняў. Напрыклад, канцэрты «30 Seconds to Mars» і якога-небудзь малавядомага беларускага калектыву. І варта задумацца над пытаннем: а што з гэтага атрымлівае сам гурт? Ды нічога ён не атрымлівае. І наўрад ці калі будзе атрымліваць штосьці ад галасаванняў такога роду.

***— Вы бачылі каментары да вынікаў галасавання? Які адказ пакінулі б удзельнікі «Не прислоняться the band»?***

**М.Ю.:** Пакідаць сваё меркаванне мы б там не сталі — яно і так відавочнае. У каго больш актыўныя прыхільнікі, той і перамагае ў інтэрнэт-галасаванні. Мы абышлі Ляпісаў, але я думаю, што ім было абсалютна пляваць на «UMA» і ніхто з піяршчыкаў культавага калектыву не займаўся распаўсюджваннем інфармацыі пра пачатак галасавання.

❍ ❍ ❍

Цырымонія ўручэння прэміі «Ultra-Music Awards 2011» адбудзецца 11 сакавіка ў клубе «Re:Public». У гэты дзень будуць уручаца ўзнагароды пераможцам у наступных намінацыях: «Лепшы замежны альбом 2011 года», «Лепшая замежная песня 2011 года», «Лепшы беларускі альбом 2011 года», «Лепшая беларуская песня 2011 года», «Лепшы беларускі кліп года», «Канцэрт года ў Беларусі». А таксама арганізатары мерапрыемства будуць уручаць узнагароды, якіх заслугоўваюць гурты па меркаванні самога «Ультра М'юзік». У мерапрыемстве прымуць удзел «Троіца», «Pomidor/Off», «IQ48», «Петля Пристрастия», «The Stampletons», «Monkey Bite», а таксама пераможцы ў намінацыях.

**Таццяна БОБЕР**
**і Аліна ШЫМАНСКАЯ.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
1 03 2012 г.

# АЛЯКСАНДРАЎ ШЛЯХ



Англія. У «Арсенале» на піку формы.

## АЛЯКСАНДР ГЛЕБ ЗМЯНІЎ ЗАХОДНЮЮ ЕЎРОПУ НА ЎЗБЯРЭЖЖА ВОЛГІ

Касмапалітызм сёння для многіх з'ява цалкам нармальная, дапушчальная. Гэта ў старой Грэцыі першы грамадзянін свету, філосаф Дыяген лічыўся дзіваком і летуценнікам. Людзі далягляд не пераходзілі. Зараз ўсё працай: чалавек можа жыць там, дзе сэрцу ўтульна, камфортна. І спорт высокіх дасягненняў у гэтым не выключэнне. Безумоўна, галоўны касмапаліт беларускага футбола апошняга дзесяцігоддзя — Аляксандр Глеб. Ён старанна працаваў на свой імідж, імя, добра гуляў у «Штутгарце» і «Арсенале», валодае нямецкай і англійскай мовамі, дачакаўся, пакуль яго прозвішча на футболках пачнуць насіць нямецкія бюргеры і англічане. Разам з Віталём Кутузавым Аляксандр — гэта галоўны брэнд беларускага футбола пачатку нулявых. Паказчык таго, як простыя хлопцы праз працу, старанне арганічна ўплятаюцца ў жыццё Заходняй Еўропы. Чым не прыклад поспеху для маладога пакалення? Аднак, на жаль, перашкоды трапляюцца там, адкуль іх не чакаеш.

Узгадваць былое — справа часам няўдзячная. Але для таго, каб выбудаваць ланцужок падзей, гэта бывае неабходна. У выпадку з Глебам нялёгкія хвіліны пачаліся пасля яго пераходу ў «Барселону» амаль чатыры гады таму. Не, тады «блаўгранас» адназначна яшчэ не была лепшай камандай свету, але зорным хлопцам Хасэпа Гвардзіёлы ўжо прарочылі лаўры футбольных канкістадораў. Гэта быў не проста калектыў, а сапраўдны россып каштоўнасцяў. У ім лепшы футбаліст Беларусі, адзін з лідараў «Арсенала», проста згубіўся. Аляксандр больш часу праводзіў на лаўцы, чым на полі. Затое футбольны «Оскар» атрымаў — калектыўна перамог у Лізе чэмпіёнаў. Але медаль лепш гуляць не вуча. Глеба справы не задавальнялі, Глеб хацеў гуляць. «Барса» дала магчымасць. Аднак касмапалітычная карусель розных клубаў — зноў «Штутгарт», «Бірмінгем» і Вольфсбург» — вістоў не дала. Старой хуткасці і дрыблінгу не было відаць, а тут яшчэ траўмы замучылі, у зборнай не атрымалася... Між іншым, здзівіла ў гэтым плане іншая акаліччасць. Футбаліст, на якога ледзь не маліласся ў свой час добрая палова балельшчыкаў зборнай, апынуўся пад жорсткай крытыкай. Так, Аляксандр не стаў месіяй для зборнай. Але і не яго віна ў тым, што ў нашым футболе гульцоў сусветнага ўзроўню што тых бурых мядзведзяў у айчыннай Чырвонай кнізе. Глеб — чалавек самадастатковы. І, нягледзячы на жорсткіх інтэрнэт-крытыканаў, ён мае поўнае права гуляць хоць у Катары, калі будзе мецць ад гэтага карысць. Гэта яго выбар. Выбар зараз аказаўся на карысць «Крылам Саветаў» з Самары, якія з апошніх высілкаў імкнуцца затрымацца ў паветры расійскай прэм'ер-лігі. Ніжэй — прорва. Магчыма, ён не так хацеў працягнуць сваю кар'еру, не ў падобнай камандзе. Але, сапраўды, каманда Андрэя Кобелева — цудоўны варыянт адрадзіць былую форму. Псіхалагічна адчуць ад партнераў падтрымку, важнасць прысутнасці на полі.

Вядомы расійскі каментатар Васіль Уткін нядаўна параўноўваў Аляксандра Глеба і Андрэя Аршавіна, футбалістаў, якія ў свой час гулялі за лонданскі «Арсенал», а зараз пераехалі ў Расію. На маю думку, Уткін даволі трапна зазначыў, што Глеб, нібы той салдат, у сваёй кар'еры разлічваў толькі на сябе, юнаком з'ехаўшы з Беларусі. З цяжкасцямі ён сустракаўся. Зараз усё ў яго руках. Галоўнае — утрымаць гэты шанц у далонях. А чароўны Глебаў дрыблінг пры добрай нагодзе, спадзяюся, мы яшчэ ўзгадаем. Галоўнае, працэс пайшоў. Падчас першых паядынкаў за «Крылы» Аляксандр адзначыўся галявой перадачай. Пачакаем, што далей.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Іспанія. У «Барселоне» Хасэп Гвардзіёла не ацаніў беларуса.

### Пра Глеба кажуць трэнеры

**Хасэп Гвардзіёла, галоўны трэнер «Барселоны»:**

— Ён у нас гуляў, але так склаўся лёс, што на поле ён выходзіў нячаста. Ён быў на другіх ролях, і гэта яму, як футбалісту, не вельмі падабалася. Таму яму прыйшлося сысці з каманды.

**Алекс Макліш, былы трэнер англійскага «Бірмінгема»:**

— Гэта цудоўны футбаліст. Ён адзін з тых, хто можа пераламаць ход гульні.

У лістападзе 2010 года Макліш дадаў: «Неаднаразова казаў яму, што фізічна ён недастаткова падрыхтаваны для таго, каб выходзіць у стартавым складзе. Ён засмучаны, што не выйшаў з першых хвілінаў на матч з «Чэлсі». Ён падумаў, што такім чынам да яго праявілі непавагу».

**Фелікс Магат, экс-трэнер Глеба ў «Штутгарце» і «Вольфсбургу»:**

— Глеб — неардынарны гулец, якому ўласціва ўзламваць абарону суперніка дзякуючы ўласнаму дрыблінгу. Так што ёсць шанц убачыць у «Вольфсбургу» сапраўднага майстра. У той жа час Глеб няпросты футбаліст, у яго на ўсё сваё меркаванне. У атацы ён адзін з мацнейшых, але ў абароне ў яго ёсць слабыя месцы.

**Андрэй Кобелеў, галоўны трэнер самарскіх «Крылаў Саветаў»:**

— Калі адбываецца падобны трансфер — я лічу, што гэта наша ўдача. Тут шмат складнікаў. Першае, што Глеб зусім нядаўна скасаваў пагадненне з «Барселонай» — ён стаў свабодным агентам. На жаль ці на шчасце, ён не паспеў падпісаць пагадненне з еўрапейскай камандай да закрыцця трансфернага перыяду. У яго, безумоўна, было некалькі варыянтаў працягу кар'еры — у Расіі ў тым ліку. Але тут, я лічу, аператыўна папрацаваў Павел Андрэеў (агент. — **Заўв. «Чырвонкі»**) разам з нашым кіраўніцтвам клуба. Жаданне Глеба мы добра разумеем: гэта чалавек вялікага ўзроўню і яму неабходна гульнявая практыка. Таму, мяркую, мы адзін аднаму павінны дапамагчы.



Расія. У «Крылах Саветаў» заваяваць новы шанц.

---

*Хобі Ты*

# СТАНЦАВАЦЬ «ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА»? НЕ ПЫТАННЕ!

**Неяк я назірала выпадак. На сцэне выступаў студэнцкі калектыў, але ў адзін з момантаў дзяўчына ўпала. Зала засмяялася. Здаецца, няшчасная толькі памылілася. Але ці так проста не памыліцца ў адказны момант?**

Фандзю, плiе, антурнан. Цікавыя, але незразумелыя словы? А я скажу, што для многіх гэтыя назвы «практыкаванняў» з класічных танцаў знаёмыя. Куды запісаць сваё дзіця ці нават пайсці самому, калі хочацца навучыцца танцаваць? Насамрэч, варыянтаў вялікае мноства. Дэбютанту варта толькі вызначыцца з напрамкам: народныя, эстрадныя, сучасныя, спартыўныя, бальныя, пластыка, усходнія, балет... Што ж, я буду зыходзіць з таго, што з напрамкам вы ўжо вызначыліся.

Ведаеце, займацца балетам, калі ты ўжо дастаткова дарослы, наўрад ці варта. Але класіка — гэта аснова. Яна вучыць правільнай пастаноўцы корпуса ў танцы. Так званы «станок» — комплекс практыкаванняў на ўсе групы мышцаў — развівае цела, дапамагае спраўляцца з нагрузкамі ў час выступлення. Але не заўсёды ў школах танца навічкоў навучаюць класічным па. «Just dance», што працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, абгрунтоўвае гэта тым, што танцуюць яны ў стылі «Хіп-хоп», але я сама бачыла, як цяжка тым, хто раней не танцаваў, зрабіць тую ці іншую звязку, калі няма ніякай падрыхтоўкі. Але пакінем гэтае дыскусійнае пытанне і вернемся да стыляў.

**ДЗЕ І ЗА КОЛЬКІ ВАС БУДУЦЬ ВУЧЫЦЬ ТАНЦАВАЦЬ?**

Напрыклад, школа танца «Мэмфіс» прапануе заняткі па спартыўных і клубных танцах. Дарэчы, гэтая студыя часта прымае ўдзел у конкурсах, так што вы будзеце мець шанц паказаць сябе шырокай аўдыторыі. Аддасце 80 тысяч рублёў за месяц, займацца будзеце два разы на тыдзень па паўтары гадзіны, калі танцы сучасныя. Заняткі па другіх напрамках працягваюцца ўсяго гадзіну. Пробны занятак тут пацягне на 12 тысяч рублёў. А індывідуальны абыдзецца вам у 45 тысяч рублёў.

А вось танцы на пілоне (эратычныя танцы) у студыі «Euphoria Pole Art» каштуюць ужо 360 тысяч рублёў у месяц. Паспрабаваць сябе ў гэтым напрамку каштуе 45 тысяч, а індывідуальны занятак — усе 80 тысяч рублёў.

А вось і народныя танцы! Але толькі стылізаваныя (г.зн. у сучаснай апрацоўцы). Такому напрамку прапануе навучыць студыя «Авантаж». Паспрабаваць тут вы зможаце бясплатна. За 8 заняткаў на месяц папросяць заплаціць 125 тысяч.

Увогуле, знайсці ў Мінску студыю народнага танца даволі цяжка. Такой харэаграфіі навучаюць дзяцей у музычных школах. Што да дарослых, тут ужо складаней, асабліва калі хочаце займацца беларускім танцам, а не ірландскім ці венгерскім, напрыклад. Але трэба адзначыць, што народны танец сёння ўжо не такі папулярны. Моладзь вабіць больш сучасная харэаграфія.

У Студыі сучаснай харэаграфіі з цаной справа крыху іншая, чым у «Авантажы». Тут ужо назіраецца дыферынцыяцыя па ўзросце. Дзіцячыя заняткі каштуюць 100 тысяч (да 18 гадоў), а дарослыя плацяць 120 тысяч за месяц.

Дарэчы, Студыя сучаснай харэаграфіі набірае групу дзетак ад 3 гадоў. Такім чынам, ваш нашчадак праз некаторы час зможа з упэўненасцю сказаць, што танцуе амаль з пялюшак.

Вось такія прапановы. Але гэта толькі прыклады «навучальных устаноў». У залежнасці ад жадання і фінансавых магчымасцяў сталіца дае шырокі выбар. Але перш чым прыйсці на занятак, менеджары ўсіх студый танцаў просяць сваіх кліентаў патэлефанаваць і ўдакладніць дэталі, каб не прыйшло занадта ранняе расчараванне.

Папярэджу вас таксама, што, на жаль, не заўсёды адбываецца так, як мы хочам: не ўсім дадзена танцаваць, як Мая Плісецкая. Не спадзявайцеся, што праз тыдзень ці два ўжо будзеце сядзець на шпагаце і ўздымаць ногі вышэй галавы. Каб гэтага дасягнуць, трэба працаваць нават гадамі.

Як выбраць школу — пытанне складанае. Параю вам апытаць знаёмых, якія ўжо запісаліся на харэаграфію. Як варыянт, можна пачытаць водгукі ў інтэрнэце. Можна абзвaніць некалькі школ і паслухаць прапановы.

І пачаць вучыцца танцаваць ніколі не позна. Напрыклад, да харэографа Алены Ляснічай (г. Хойнікі) займацца ў студыю прыходзяць дарослыя жанчыны.

— Вядома, майстрамі яны ўжо не будуць, — кажа Алена Васільеўна. — Але танец прыносіць ім вялікае задавальненне. Нават выступаем з імі на канцэртах. Вядома, для прафесіяналаў пастаноўкі здадуцца занадта лёгкімі. Толькі танец са сцэны выглядае ўсё роўна прыгожа, таму што танцоры стараюцца.

Другое пытанне — з якіх танцаў пачынаць плённую працу. Гледзячы на тое, што ўсе танцавальныя студыі адкрываюць класы для навічкоў, мусіць, гэта не так істотна. Да чаго душа ляжыць, туды і ісці трэба. Зычу творчых поспехаў!

**Марыя БАЗУЛЬКА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

# СУБКУЛЬТУРЫ ПАКАЛЕННЯ

**Бывае, што гуляючы па гарадскіх вуліцах можна сустрэць незвычайна апранутых маладых людзей. Некаторых яны прываблівацюь, некаторыя захапляюцца імі, а ёсць і такія, што на дух не пераносяць іх стыль... Старыя традыцыі для такіх людзей — вышэй за ўсё, і таму ім здаецца, што моладзь ужо не такая, як раней. Аднак моладзь усё тая ж, і інтарэсы ўсё тыя ж, толькі выяўляе яна іх па-іншаму.**

Незвычайныя па выглядзе маладыя людзі адносяцца да пэўных субкультур. Яны могуць адрозніваца па ўзросце, расе, этнічнай або класавай прыналежнасці, полу. Звычайна гэта падлеткі, якія імкнуцца быць падобнымі на куміраў з музычнага алімпу, на кінаакцёраў або зорак глянцавых часопісаў. Мы часам забываем, наколькі ўсе гэтыя дробязі ўплываюць на светаўспрыманне.

Наогул, падлетак часта губляецца, бачачы, як яго аднагодкі дзеляцца на кампаніі па інтарэсах. Тады, не ведаючы, да якога стылю яму далучыцца, у выніку выбірае, арыентуючыся на знешні выгляд, а не на сутнасць плыні. Акрамя таго, пры захапленні нейкай сімволікай, якая фарміруе светапогляд, узнікае своеасаблівая залежнасць. Усвядомяць гэта падлеткі або не, аднак аднойчы можа наступіць абсалютны сыход ад рэальнасці. І хто ведае, якімі могуць быць наступствы. Вось некалькі прыкладаў субкультур, якія найбольш часта сустракаюцца ў нас.

Калі вам сустрэўся чалавек з прычоскай у выглядзе касога, ірванага чуба да носа, які закрывае адно вока, а ззаду — кароткія валасы чорнага колеру, якія тырчаць у розныя бакі, з пірсінгам, часцей за ўсё на твары, пры гэтым вочы і пазногці афарбаваныя таксама ў чорны колер, у ружова-чорным адзенні з двухколерным ўзорамі — гэта, несумненна, эма. Іх крэда — імкненне да перажывання яркіх і чыстых эмоцый і ўменне іх выразіць. Іх імпульсіўнасць часта хавае іх утоеныя намеры і дапамагае дамагчыся таго, да чаго яны імкнуцца, нават калі прыходзіцца ісці па галовах.

Кідкая прычоска ў выглядзе пеўневага грэбня, скураны пінжак на голым целе, палатняная тканіна тонкай кашулі з жабо, завушніцы на твары і ў вушах, грубіянскі жаргон і непрыстойныя паводзіны гавораць нам аб тым, што мы маем справу з панкамі. На жаль, часам многія з іх ужываюць спіртныя напоі, таксічныя рэчывы, і там, дзе яны з'яўляюцца, павялічваецца магчымасць бойкі, рабавання, і на вашу галаву можа зваліцца куча нечаканых непрыемнасцяў. Умоўна можна вылучыць дзве катэгорыі групы панкаў. Першыя абуральна апранаюцца, імкнуцца як мага радзей мыцца, лічаць, што мацюкі — гэта модна, хуліганяць, кураць «траўку» — на большае ў іх не хапае інтэлекту. Яны нават слухаюць музыку сваёй субкультуры, не ўнікаючы ў сутнасць. Другая група панкаў — крыху старэйшыя, паводзяць яны сябе не так агрэсіўна, да музыкі ставяцца сур'ёзна, многія самі граюць на музычных інструментах. Зрэдку яны нават не супраць пачытаць кнігі. Так што не варта да ўсіх панкаў ставіцца з асцярогай, іх імідж псуюць толькі няўмелыя навічкі.

Спыняючыся на готах, можна сказаць, што збольшага яны носяць чорную адзежу, фарбуюць пазногці, валасы і вусны ў чорны колер і падводзяць вочы. Хоць гэтае апісанне падыходзіць не да ўсіх готаў, але вялікая частка выглядае менавіта так. Разнастайнасцю ў знешнім выглядзе готы абавязаны ў першую чаргу імкненню да артыстызму і самавыяўленню. Іх светапогляд складаецца ў рамантычна-дэпрэсіўным поглядзе на свет. На фарміраванне гэтага руху аказаў уплыў вампірскі вобраз. Не сакрэт, што сёння фільмы пра вампіраў карыстаюцца велізарным поспехам, з-за чаго гледачы абавязкова хочуць быць падобнымі да ўпадабаных акцёраў.

Гісторыя ж рокераў пайшла ад матацыклаў. Спачатку слова рокер для многіх з'яўлялася абразай, лаянкай, але затым людзі сталі самі сябе так называць, і ўсё гэта ператварылася ў цэлую субкультуру. І, насуперак грамадскай думцы, не ўсе рокеры п'яніцы і дэбашыры. Шмат хто займаецца сур'ёзнымі справамі і толькі зрэдку любіць добра пагуляць. Трэба сказаць, што зараз зусім мала маладых людзей, якія цікавяцца гэтай субкультурай. Тым не менш яны ёсць, і таму рок будзе жыць.

**Лізавета БЕЦКО, студэнтка БДУ:**

— Я — рокер у шырокім сэнсе слова. Раней была чыста металісткай, слухала метал розных кірункаў — хэві, паўэр, сімфа... А зараз, акрамя металу, слухаю серф-рок, рок-н-рол, постпанк, гэта значыць, музыку больш лёгкую. Чаму? Таму што мне падабаецца такі стыль жыцця і такая музыка. Зусім не абавязкова выглядаць, як металіст, трэба жыць, як металіст, трэба так адчуваць.



Часам здаецца, што наша жыццё не было б гэткім цудоўным без гламуру. Прыгожыя і кідкія ўборы, бляск бранзалетаў і пярсцёнкаў, сумесь водараў надушаных цел — адным словам, гэта калі таямніца жыцця ляжыць не ўсярэдзіне, а на паверхні. Як вы ўжо зразумелі, гламур прынята вылучаць у асобную субкультуру. Ідэалогія гэтага кірунку даволі простая: гламурны чалавек павінен выглядаць хораша. Адзенне, абутак, аксэсуары — усё гэта павінна быць абавязкова фірмовым, прычым такім, якое знаходзіцца на грэбні моднай хвалі. Ідэі гламура, па сутнасці сваёй, пазітыўныя. Яны не нясуць сталых невырашальных праблем. Хутчэй наадварот, гламур — гэта маніфестацыя жыцця без праблем наогул. Часам яго завуць субкультурай пазітыву, дзе прадстаўнікі плыні жывуць у штучна створаным свеце, у якім усё добра. Галоўная мэта прадстаўнікоў гэтага кірунку — прымыкаць да ідэалаў, створаных глянцавымі часопісамі.

**Дзіяна ЛАШУК, студэнтка БДУ:**

— Наогул, гламур у перакладзе з англійскай — азначае шарм і зачараванне. Гэта цяпер у нас гэты стыль асацыюецца з чымсьці вычварным і вар'яцка яркім. Для мяне гэта хутчэй — жаноцкасць, акуратнасць у адзенні з якімі-небудзь яркімі акцэнтамі. Але гэта неабавязкова мініспадніцы і таму падобнае. Наогул, сапраўдныя гламурныя дзяўчыны заўсёды годна трымаюцца і ведаюць сабе цану, але пры гэтым не выглядаюць вульгарна або недарэчна. Шкада, што многія не бачаць сёння розніцы паміж гламурам і «праборам». Дзяўчына, якая добра апранута, прыцягвае да сябе ўвагу, але часта гэта не зусім прыемна. Напрыклад, прыстаюць усякія іншаземцы або проста якія-небудзь «недарэчныя» асобы. Часам выкладчыкі пачынаюць рабіць заўвагу, што ва ўнівер трэба хадзіць «манашкай»... Іншыя дзяўчаты таксама часта могуць пусціць з'едлівае за спінай. Але гэта, як той казаў, выдаткі. Сапраўды людзей, якія так неадэкватна рэагуюць, дастаткова, і трэба паменш зважаць на іх. А з плюсоў (акрамя ўвагі з мужчынскага боку) — спакойна праходзіш дрэскод у клубах і наогул такім дзяўчатам часцей усміхаюцца, таму што пры выглядзе паненкі ў такім строі нельга хадзіць з журботным тварам. Афіцыянты, бывае, падаюць сюрпрызы: то на каве шакаладам што-небудзь намалююць, то вішаньку ў дэсерт лішнюю пакладуць. Але гэта стыль для дзяўчат некрыўдлівых і незалежных ад чужога меркавання, таму што шмат каму захочацца паспрабаваць іх закрануць чымсьці малапрыемным.

Такім чынам, не трэба забываць, што, як бы чалавек і спрабаваў сябе праявіць, не варта ставіцца да яго неяк па-асабліваму або пагарджаць ім, бо ён такі ж, як і ўсе астатнія людзі на планеце, а адрозніваецца толькі знешнім выглядам і сваім светапоглядам, як, зрэшты, і кожны з нас.

**Ганна БУРАК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕО ПРОВЕДЕНИИ 03 апреля 2012 года ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

**Продавец, юридический адрес:** Открытое акционерное общество «Жлобинская швейная фабрика», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 17, тел. (02334) 2 26 90

| № лота | Наименование объекта (лота) | Краткая характеристика и адрес объектов (лота) |
|---|---|---|
| 1 | **Нежилое изолированное помещение, инв. № 320/D-25212** | Назначение: торговое помещение<br>Характеристика: помещение расположено на первом этаже двухэтажного кирпичного здания 1956 года постройки.Общая площадь: 111,5 кв.м. |
| | Адрес объекта | г. Жлобин, ул. Петровского, 17/2-1. |
| | Начальная цена продажи объекта (лота) с НДС | **500 800 000** белорусских рублей |
| | Задаток | **10 000 000** белорусских рублей |

Аукцион состоится **03 апреля 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд, тел./факс (+375 2334) 3 14 08.

Возможность ознакомиться с объектом предоставляется продавцом в срок по **30 марта 2012 г.** включительно.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок **по 30 марта 2012 года с 9.00 до 17.00 по рабочим дням** представить в адрес организатора аукциона следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;

- платежное поручение о внесении задатка;

- юридические лица (резиденты Республики Беларусь) – доверенность представителя юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

- представители физических лиц (резидентов Республики Беларусь) – нотариально заверенную доверенность;

- индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации;

- юридические лица (нерезиденты Республики Беларусь) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц (нерезидентов Республики Беларусь) – легализованную в установленном порядке доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45, 2-й подъезд.

Задаток перечисляется на р/с КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» № 3012006530013 в филиале 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним претендентом, предмет аукциона продается этому претенденту при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель торгов обязан:

- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона внести на расчетный счет КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» вознаграждение по результатам аукциона в размере 4% от начальной цены приобретаемого объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов.

- в течение 20 дней с даты подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи объекта;

- в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи произвести оплату за объект.

Организатор открытых торгов вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее чем за 7 (семь) календарных дней до наступления даты его проведения.

Участник аукциона имеет право отказаться от участия в торгах. Отказом признается как письменное заявление, так и неявка на аукционные торги. В этом случае задаток ему возвращается в течение 5 (пять) рабочих дней со дня обращения либо со дня проведения торгов.

**Телефоны организатора аукциона для справок: (02334) 2 18 18, 3 14 08.**


*Ведай нашых!*

## «СІНЯЯ ПТУШКА БЕЛАРУСІ» Ў ДАЎГАЎПІЛСЕ СТАЛА ЗАЛАТОЙ

**Віцебскі народны моладзевы тэатр «Кола» Цэнтра культуры «Віцебск» заваяваў першае месца на Міжнародным фестывалі масачных традыцый у Даўгаўпілсе, куды прыехалі калектывы з Латвіі, Літвы і Беларусі.**

Моладзевы тэатр «Кола» Цэнтра культуры «Віцебск»— неардынарны і крэатыўны творчы праект рэжысёра Уладзіславы Цвікі. Ён быў створаны ў 2006 годзе на базе студыі акцёрскага майстэрства і ў кароткія тэрміны апраўдаў сваё існаванне тэматычнай і ідэйнай актуальнасцю пастаўленых спектакляў. У «Коле» расказваюць гледачам пра тое, што хвалюе сучаснае грамадства і кожнага чалавека паасобку. Акцёры тэатра — школьнікі, студэнты, маладыя людзі, якія працуюць.

Тэатр «Кола» за тры фестывальныя дні выступаў шэсць разоў. У дзень адкрыцця на парадзе сучаснай нетрадыцыйнай моды і прычосак «Кола» прадставіла тэатралізаванае дэфіле «Уся справа ў бураках». Далей тэатр чакала Даўгаўпілская гімназія, а потым — Цэнтр латышскай культуры. Гледачам спадабалася праграма «Бульба». Увянчала ж насычанае латышскае падарожжа віцебскага тэатра выступленне пад назвай «Сіняя птушка Беларусі», за якое «Кола» і атрымала першае месца.

Цяпер тэатр асвойвае зусім новы для віцебскіх тэатральных традыцый напрамак — форум—спектакль, галоўная асаблівасць якога — актыўны ўдзел гледачоў у дзеі спектакля на сацыяльна-псіхалагічную тэму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Вясна-лета-2012:

# ГЕАМЕТРЫЯ СЕЗОНА

**З надыходам вясны і першых цёплых дзён так і хочацца скінуць зімовае адзенне і апрануць прыгожую сукенку і лёгкае паліто. Што падрыхтавалі нам знакамітыя куцюр'е і сусветныя подыумы, каб кожная з нас адчула сябе асаблівай? Што насіць гэтай вясной і якой будзе вясенне-летняя мода 2012? Жаноцкасць і натуральная прыгажосць — галоўныя прыярытэты гэтай вясны. Адзенне прызвана ўпрыгожваць і падкрэсліваць вартасці вашай фігуры.**

### ПАЛІТО

Пачнём з верхняга адзення — лёгкія прыталеныя паліто не выйдуць з моды і гэтай вясной. Паліто выдатна спалучаецца з астатнімі элементамі стылю, а яго фасонаў так шмат, што для сябе штосьці знойдзе нават самая прыдзірлівая модніца.

### ЖАКЕТ

Галоўны трэнд гэтага сезона — гэта жакет ці пінжак на мужчынскі манер. Гэтая навінка перайшла яшчэ з восені. Адзенне з «мужчынскага пляча» падкрэслівае жаноцкасць уладальніцы, галоўнае — не перабраць меру. Пінжак выдатна спалучаецца са спадніцай, сукенкай і штанамі.

### ЯКІ КОЛЕР У МОДЗЕ?

Мадэльеры не рэкамендуюць нам пасля халодных дзён адразу апранаць яркія і сочныя колеры, наадварот, падбярыце светлыя і пяшчотныя адценні — персікавы, бэжавы, ружовы, блакітны. Гэтыя колеры будуць як ніколі арганічныя ў новым сезоне, а выглядаюць яны свежа, па-жаноцку і вытанчана. Абсалютным хітом гэтай вясной стане белы колер. Гэты непрактычны, але прыгожы колер стаў любімым у многіх дызайнераў знакамітых дамоў мод. Паспрабуйце і вы!

### ГЕАМЕТРЫЯ

Навінка сезона — геаметрыя на вашым уборы. Блочны малюнак скарае сусветныя подыумы. Дарэчы, такі малюнак — гэта выдатны спосаб зрабіць нябачнымі дробныя недахопы, а свой рост візуальна крыху вышэйшым. А яркія спалучэнні колераў падкрэсляць вашу асаблівасць. Што датычыцць даўжыні, то тут мадэльеры не сталі вынаходзіць нічога новага. У модзе па-ранейшаму даўжыня да калена ці крыху вышэй. А для ўрачыстых выпадкаў дызайнеры прапаноўваюць вытанчаныя сукенкі «ў падлогу».

### СУКЕНКІ

Сукенкі белага колеру літаральна захапілі ўсе модныя подыумы — такога трыумфу белага колеру мы не бачылі даўно. Дызайнеры настойліва рэкамендуюць набыць у свой гардэроб хаця б адну сукенку белага колеру, а стыль і фасон вы можаце падабраць на свой густ. Тым больш што куцюр'е пастараліся на славу, каб прапанаваць нам самыя розныя сукенкі — ад дзелавых да пляжных варыянтаў. Паднясць сабе настрой можна і яркімі фарбамі. Выдатнае рашэнне — гэта сукенка з прынтам, у ёй вы будзеце ў цэнтры ўвагі. Дызайнеры нам прапаноўваюць самыя розныя варыянты прынтоў — ад арнаменту да самых смелых эксперыментаў.

Даўжыня сукенкі ў гэтым сезоне застаецца даволі класічнай: актуальныя сукенкі да калена і «ў падлогу». Але калі вы вялікая прыхільніца міні, можна не здраджваць свайму густу: дызайнеры не абышлі ўвагай і кароткія сукенкі, хоць яны і былі крыху менш папулярнымі.

Карункі, паеткі, шыфон, аборкі — усё, што робіць вобраз рамантычным і жаноцкім, вельмі актуальна гэтай вясной. Паўпразрыстыя сукенкі з рушамі і бляскам проста заварожваюць — яны ідэальныя для спатканняў і вандровак. На модныя подыумы літаральна ўварваліся сукенкі без шлеек, бо вельмі многія дызайнеры, быццам бы згаварыўшыся, прадэманстравалі іх на сваіх паказах. Што ж, гледзячы на гэтыя сукенкі, мы сапраўды прызнаём, што гэта ўдалы ход. Сукенкі сапраўды неверагодна жаноцкія і эфектныя. Прыгожы жаноцкі сілуэт застаецца галоўным прыярытэтам гэтай вясной, а таму мы ўбачым шмат прыталеных (ці з раменьчыкам) сукенак. Каб падкрэсліць сваю фігуру, вы таксама можаце выбраць сукенку-футляр, а выбіраючы сукенку з пышнай спадніцай, зрабіце акцэнт на таліі. Не губляюць актуальнасці і сукенкі з заніжанай таліяй.

### ШТАНЫ

Неверагодна папулярнымі на подыумах знакамітых куцюр'е былі ўкарочаныя штаны — абсалютны хіт! Вы можаце вар'іраваць колер і фасон, але абавязкова паспрабуйце прымераць такія мадэлі, якія з туфлямі ці басаножкамі на высокім абцасе выглядаюць асабліва прывабна.

Абсалютна летні варыянт — шырокія штаны. Яны выдатныя для вясенніх і летніх прагулак. Вузкія штаны скаралі подыумы ў мінулыя сезоны, але і дагэтуль яны не здаюць сваіх пазіцый. Штаны, якія сэксуальна абцягваюць нагу па ўсёй даўжыні, скарылі дызайнераў, таму аматаркі такіх мадэляў могуць не развітвацца з імі і гэтай вясной. Але падчас выбару такіх штаноў трэба памятаць, што яны падкрэсліваюць не толькі вартасці фігуры сваёй уладальніцы, але і ўсе недахопы.

Застаюцца ў модзе і штаны-бананы, якія палюбіліся многім дзяўчатам. Незвычайная форма і мадэль, якая будзе па фігуры многім прыгажуням, — гэта, бадай, асноўны сакрэт поспеху штаноў-бананаў. Яшчэ зусім нядаўна мы насілі блузу паверх штаноў, а ў сезоне 2012 усё наадварот! Мадэльеры запраўляюць верх у штаны, і гэта выдатнае рашэнне, бо такім чынам падкрэсліваецца талія, якая, да таго ж, акцэнтуецца яшчэ і раменьчыкам.

### СПАДНІЦЫ

У новым сезоне подыум завявалі доўгія максі-спадніцы, прычым самых розных фасонаў — струменістыя каля ног ці пышныя, з лёгкай тканіны. Доўгая спадніца — гэта, хутчэй, прагулачны варыянт ці круізны, таму калі вы збіраецеся ў адпачынак, звярніце ўвагу на максі-спадніцу.

У модзе жаноцкія, лёгкія тканіны. Актуальныя пяшчотныя, карункавыя спадніцы, якія ствараюць выдатны вясенні вобраз. На подыумах можна ўбачыць карункавыя спадніцы розных колераў — ад класічнага белага да ярка-чырвонага. Жаноцкія, няўлоўныя шыфонавыя спадніцы не адстаюць па папулярнасці ад карункавых. Не забываем і пра класіку, а менавіта — пра элегантную спадніцу-аловак. У новым сезоне актуальнымі будуць не толькі класічныя аднатонныя мадэлі, але і спадніца-аловак з дэкорам — пацеркамі, заклёпкамі, камянямі.

### ПІНЖАКІ

Сезон вясна-лета-2012 у многім арыентаваны на жаноцкасць, і пінжак не з'яўляецца выключэннем. Акцэнт на таліі — адзін з галоўных трэндаў сезона. Выбіраючы пінжак, прыгледзьцеся да прыталеных мадэляў. Як правіла, выглядаюць гэта будзе вельмі элегантна. Правераны спосаб падкрэсліць талію — рэмень. Ён актуальны і зараз. Яшчэ адзін спосаб падкрэсліць талію — укарочаны пінжак. Выдатная і даволі новая модная ідэя. Апранаючы ўкарочаны пінжак з топам ці штанамі, вы атрымліваеце выдатны паўсядзённы вобраз.

У новым сезоне дызайнеры ўпрыгожваюць пінжакі на самы розны манер: пацеркі, вышыўка, карункі — па-сапраўднаму тонкая і прыгожая праца. Такі пінжак выглядае не толькі стыльна, але і вельмі дорага. Вы самі можаце ўпрыгожыць свой пінжак, кіруючыся ўласнымі фантазіяй і густам.

Падрыхтавала
**Алена АЎЧЫННІКАВА.**







Тусім

# СВЯТА ТОЛЬКІ ДЛЯ ВАС

**Студэнты, як вядома, народ вясёлы. Часта здараецца так, што забаў, свят, гульняў, якія існуюць, ім недастаткова, і яны «прыдумляюць» новыя. Сёння мы пагаворым пра арыгінальныя — тыя, што існуюць толькі ў пэўным асяродку «студэнцкай брацііі», — святы.**

### ВЯРОЎКА-ГАРДЭРОБ І «ЦЯЛЬНЯШКАВЫ» ДЗЕНЬ

Напрыклад, студэнтка Інстытута журналістыкі Вольга Астаповіч адкрыла мне некалькі сакрэтаў, дзякуючы якім можна аздобіць любую праграму: «Каб любое свята праходзіла весела (а студэнты могуць арганізаваць што-небудзь на пустым месцы!), не пашкодзіць прыдумаць некалькі правілаў. Гэтыя правілы, вядома, не падобныя на правілы з падручніка. Усе яны носяць, так сказаць, не абавязковы, а рэкамендацыйны характар. Напрыклад, калі мы святкавалі медыум з нашым курсам, прыдумалі дрэс-код — вырашылі апрануцца ў чырвонае. Тыя ж, хто не знайшоў вопраткі патрэбнага колеру ці наогул забыўся на гэтае патрабаванне, маглі карыстацца нашай цуда-вяроўкай-гардэробам, на якой па гусце і памеры можна было і чаравікі чырвоныя знайсці, і майкі, і хусцінкі».

Акрамя таго, група праводзіць і тэматычныя вечарыны. Галоўнае патрабаванне: каб усім было весела і цікава. Так, у Вольгі і яе аднагрупнікаў ёсць сваё арыгінальнае свята — Дзень Белуша (Белуш — легендарны персанаж). Свята праходзіць у канцы лістапада, на яго ўся група ходзіць у цяльняшках. Традыцыя — есці торт усім разам лыжкамі (не разразаючы). Як адзначыла Вольга, нярэдка да іх далучаюцца і іншыя студэнты.

### КВАТЭРНІКІ

Сярод студэнтаў нямала і творчай моладзі: хтосьці танцуе, хтосьці піша вершы, хтосьці грае на музычным інструменце. Здараецца, такія студэнты-музыканты аб'ядноўваюцца ў музычныя гурты, а бывае, проста праводзяць канцэрты, дзе выконваюць любімыя творы.

Юрась Ускоў — студэнт БДУ — займаецца арганізацыяй канцэртаў. Як ён сам прызнаўся, сярод яго сяброў ёсць пэўная колькасць апантаных музыкай людзей, якім прыемна бавіць час, падыгрываючы адно аднаму на розных музычных інструментах. А пачалося ўсё гады са два таму — пачалі збірацца, ладзіць такія вечарыны. Музычныя інструменты, як і накірунні, самыя розныя: гітара, клавішы, бас, губны гармонік, флейта.

Што датычыцца арганізацыі саміх канцэртаў, то яны праводзяцца па традыцыі 80-х: на кватэрах у сяброў, знаёмых (таму і называюцца такія выступленні кватэрнікамі). Звычайна канцэрт на 50% складаецца з выступленняў і на 50% — з размоў. Але ўсё залежыць ад выступоўцы. Нярэдка на вечарынах бываюць і вядомыя ў пэўных колах выступоўцы. Пра гэта распавёў сам Юрась: «Перыядычна запрашаем расійскіх, прычым досыць вядомых музыкантаў. Толькі за апошнія два гады два разы на кватэрніках іграла Умка з гурта «Умка і Браневік». Сярод іншых музыкантаў, што ігралі ў Мінску кватэрнікі, былі: Васіль К. (Расія-Швецыя), гурт «Выход» (калісьці папулярны на ўзроўні «Акварыума» і «Кіно»), «Рада и Терновник» (Масква), Вадзім Курылёў (экс-ДДТ), Чорны Лукіч (экс-»Гражданская Оборона)».

Гаворыць, студэнцкія гады — самыя вясёлыя ў жыцці. Калі так, то сапраўды маюць рацыю тыя маладыя людзі, што не лянуюцца прыдумваць і арганізоўваць для сябе, сваіх сяброў новыя святы, забаўляльныя праекты. Гэта тое, што запомніцца на ўсё жыццё. І яшчэ: у будучыні не давядзецца шкадаваць, што «не нагуляліся» ў свой час.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,**
**студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА
